


Ніва

ТЫДНЁВІК ГП БГКТ

№ 2 (881) ГОД XVIII БЕЛАСТОК 14 СТУДЗЕНЯ 1973 г. ЦАНА 60 гр.



Родны краявід. Над ракой Нараўкай. *Фота Я. Цялушэцкага*





БРАТЫ ПА КРЫВІ

Цягнік з Масквы прыбыў на станцыю Старабельск дакладна паводле раскладу. Пасажыры спешна выходзілі на заліты шчодрым чэрвеньскім сонцам перон. Іван Яфімавіч уважліва ўглядаўся ў кожнага прыбыўшага, які накіроўваўся да выхаду ў горад. Але таго, каго ён павінен быў сустрэць, не было: «Няўжо затрымаўся ў Маскве?..»

Прастаяўшы на станцыі вызначаны яму графікам час, цягнік накіраваўся далей, на Варашылаўград.

Расчараваны і знерваваны Іван Яфімавіч пайшоў з перона на прывакзальную плошчу, да аўтобуснага прыпынку. І раптам ля газетнага кіёска ён убачыў мужчыну, які глядзеў на яго ўсміхаючыміся вачыма.

— Шура!

— Ваня!

Яны абняліся.

Так позняй чэрвеньскай раніцай 1972 года сустрэліся два старыя сябры. Сустрэліся праз 30 год пасля першай сустрэчы.

А першая сустрэча адбылася...

...калі Івану Кулачко было дваццаць гадоў. Малады воін — учарашні калгаснік з сяла Байдоўкі Старабельскага раёна — у ліпені 1941 года ў цяжкім няроўным баі з гітлераўскімі захопнікамі, калі не было ўжо ні сілы, ні патронаў, трапіў у палон.

Праз шэсць страшэнных фашысцкіх лагераў для савецкіх ваеннапалонных прайшоў Іван Кулачко: у Магілёве, Барысаве, Оршы, Маладзечне, Беластоку, Харошчы. З кожнага ўцякаў. Яго лавілі, білі, ізноў кідалі ў лагер. На гэты раз Іван Кулачко ўцёк разам з сябрамі з лагера каля Харошчы. Хаваўся ў лесе недалёка ад вёскі Новы Востраў Беластоцкага ваяводства. Тут выпадкова сустрэў 16-гадовага Шуру Казлоўскага, польскага беларуса, які збіраў хворост. Пазнаёміліся. Шура запрапанаваў Івану ісці разам з ім у сяло. Прыйшлі ў хату Казлоўскіх, калі ўжо было цёмна. Сям'я Шуры — бацька Аляксандр, маці Софія, сёстры Зіна і Валя — прыняла яго, як роднага. Іван стаў членам сям'і, стаў сынам і братам.

У сяле ў той час было трывожна: нямецкія жандары і мясцовыя паліцаі шнырылі па дварах. Яны праводзілі «мабілізацыю» моладзі на работу ў Германію. Івана схавалі на гары. Часамі ноччу ён вылазіў са свайго сховішча і накіроўваўся ў лес з надзеяй знайсці партызанаў. Але іх у той час яшчэ не было.

Аднойчы ўдзень, калі жандары паехалі з сяла, Іван спусціўся з гары. Тут, у хаце, яго ўбачыла суседская дзяўчынка. Сказала свайму бацьку. Той — старасце. Прыйшлі паліцаі і арыштавалі Івана. Выслалі яго ў Шудзялоўскую гміну. Там, у нямецкай камендатуры,

(Працяг на стар. 6)

БАГАТАЯ ПРАЦА Ў КЛУБЕ Ў ЛУЦЭ

Клуб «Руху» ў Луцэ Гайнаўскага павету адыгрывае важную ролю ў гэтай вёсцы. Тут ставіліся пастаноўкі «Гарадскія госці» А. Барскага, «Конская кніжка» Ул. Паўлючука і іншыя. У клубе адбываюцца маладзёжныя сходы, гарцэрскія і зухаўскія гульні, дзеці прыходзяць сюды глядзець казкі з каляровых дыяфільмаў, малявацъ, а нават рыхтаваць урокі. Старэйшая моладзь цікавіцца кінафільмамі, якія можна глядзець па тэлевізару, пасля дыскутуе над імі, апрача таго, арганізуе забавы, робіць дэкарацыю клуба. Калі мы наведалі клуб, моладзь рыхтавалася да навагодняга балю. Каб у клубе было прыемней, сцены абклеілі тут свежай паперай. У арганізацыі шматлікіх культурных мерапрыемстваў найболыш вылучаюцца кіраўнік клуба Раіса Карольчук (на здымку), Янка Васільчык, Янка Стоцкі і Яўген Харкевіч.

Тэкст і фота Я. Цялушэцкага



ПАМЁР ВАСІЛЬ БАРТНІЧУК

16 снежня 1972 года памёр Васіль Бартнічук — чалавек правы, сціплы, справядлівы, чалавек, якога ўсе шанавалі, а асабліва актыў Беларускага таварыства ў Мілейчыцах. Сямяціцкі аддзел супольна з мілейчыцкім 100-асабовым гуртком БГКТ часта арганізаваў сустрэчы перад гадавінамі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, удзельнікам і палымяным абаронцам якой ён быў. Служыў ён тады на караблі «Андрей Первозванный» і разам з петраградскімі рэвалюцыйнымі матросамі змагаўся на смерць і жыццё за перамогу чырвоных атрадаў.

Многа цікавых эпізодаў з тых часоў расказаў Васіль Бартнічук жыхарам Мілейчыц.

Члены праўлення сямяціцкага аддзела прынялі ўдзел у пахаванні Васіля Бартнічука — свайго актывіста і зложылі вянок ад імя аддзела на яго магіле. Падчас пленума аддзела ўсе прысутныя ўшанавалі яго памяць хвілінай цішыні. (мх)

БГКТ ХРОНІКА

■ 30 снежня адбылося пасяджэнне Прэзідыума Галоўнага праўлення БГКТ. Кіраўнік адміністрацыйнага аддзела Ваяводскага камітэта ПАРП Здзіслаў Рыбіцкі паведаміў прысутным аб тым, што дагэтуляшні штатны член Прэзідыума ГП Янка Зенюк накіраваны да іншай работы (на пасаду дырэктара Ваяводскай педагагічнай бібліятэкі) і ў сувязі з гэтым ад 1 студзеня штатным працаўніком Прэзідыума ГП будзе старшыня ГП Мікалай Самоцік — да тэтага старшыня павятовай рады нарадовай у Гайнаўцы. Таварыш Рыбіцкі, выказваючы ад імя Ваяводскага камітэта шчырую падзяку за працу і складаючы пажаданні далейшай плённай працы ў БГКТ як грамадскаму сакратару ГП, удэкараваў Янку Зенюка адзнакай «Заслужаны Беласточчыне».

Затым па чарзе Прэзідыум разглядзеў пункты павесткі дня: 1) справаздачу аб працы ГП у апошнім квартале 1972 года, гэта значыць ад з'езду БГКТ, 2) план працы на першае паўгоддзе 1973 года, 3) інфармацыю аб выкананні бюджэту БГКТ у 1972 годзе і аб бюджэце БГКТ на 1973 год, які прыдзяліла нам Міністэрства ўнутраных спраў.

У сувязі з наступаючым новым годам Міністэрства ўнутраных спраў прыдзяліла іменныя грашовыя ўзнагароды старшыні ГП Мікалаю Самоціку і члену Прэзідыума ГП Аляксандру Баршчэўскаму і рэчавыя ўзнагароды сакратару ГП Янку Зенюку і старшыні рэвізійнай камісіі Міхасю Хмялеўскаму. Апрача таго, Міністэрства прыдзяліла 5 тыс. зл. для актыву БГКТ. Прэзідыум ГП на гэтым жа пасяджэнні раздзяліў гэтую суму паміж наступнымі асобамі: Аляксандрам Рафаловічам з Саколкі, Уладзімірам Раеўскім з Бельска Падляшскага, Ганнай Амбражэй з Беластока, Нінай Мушынскай з Гарадка і Валяй Мароз з Паўлаў.

■ З нагоды 50-ай гадавіны ўтварэння СССР актывіст гайнаўскага аддзела БГКТ Уладзімір Гацута ў снежні выступіў у многіх вёсках з дакладамі. У Койлах, Чэхах Арлянскіх, Махнатым, Карыцісках і Нарве ўрачыстыя вечары з дакладам Уладзіміра Гацуты адбываліся ў клубах селяніна.

■ Гурток БГКТ у Плёсках (Бельскі павет) нядаўна арганізаваў урачысты вечар, прысвечаны залатому юбілею СССР. З дакладам выступіла старшыня гуртка Людміла Васілюк. Пасля распачалася мастацкая частка, галоўным пунктам якой быў канцэрт мясцовага квартэту.

Гаворачы аб плёскаўскім гуртку БГКТ, варта адзначыць і тое, што ён рыхтуецца да конкурсу «Калядных мастацкіх калектываў», які арганізоўвае павятовы аддзел культуры ПРН супольна з домам культуры.

■ У снежні ў 100 працэнтах аплацілі членскія складчыны за 1972 год гурткі БГКТ у Малочках (старшыня Янка Хмур), Міклашах (старшыня Мікалай Гонта), Аўгустове (старшыня Яўгень Аніська), Войшках (старшыня Ірэна Баўдзейчук) і шмат іншых.

■ У лютым адбудзецца ў Бельску Падляшскім агляд драматычных калектываў. Да яго рыхтуюцца, між іншым, самадзейнікі з Мокрага, Плёсак і Катлоў.

■ У конкурсе «Беларуская песня — 73» у Бельскім павеце выказалі ахвоту прыняць удзел жанчыны з Малочак, моладзь з Дубяжына і некаторыя ліцэісты з беларускага ліцэя.

■ 29 снежня харавы калектыў бельскага аддзела БГКТ выступіў з канцэртам на павятовай акадэміі, прысвечанай 50-ай гадавіне СССР, якую арганізаваў павятовы камітэт ПАРП.

■ Актыў Беларускага таварыства горада Беластока добра гуляў на навагоднім балі ў памяшканні ГП. На некалькі мінут перад Новым годам з цёплымі пажаданнямі выступіла кіраўнік культурна-асветнага аддзела БГКТ Валя Філіпюк. (мх)

Падзеі ◊ Здарэнні ◊ Факты ◊ Каментарыі ◊ Весткі

СВЕТ | БССР | ПОЛЬШЧА | ВАЯВОДСТВА

СВЕТ

ДВА НАПРАМКІ

У часе, калі пішам гэты матэрыял, свет жыве пад уражаннем В'етнама. Усе чакаюць перагавораў у Парыжы паміж прадстаўнікамі ДРВ і адміністрацыяй Ніксана. Ніхто не можа прадбачыць іх вынікаў.

Аднак у амерыканскай грамадскай думцы можна вылучыць як бы два напрамкі: рэакцыйны і рэалістычны.

Рэакцыйны напрамак прадстаўляюць так званыя «ястрабы». Іх лозунг «Раз, але паспяхова»: згаджаюцца яны на размовы ў Парыжы, але, паводле іх, павінны яны адбывацца з пазіцыі сілы. Заклікаючы Ніксана да працягвання вайны ў В'етнаме, некаторыя рэакцыйныя палітыкі ЗША напомнілі былога прэзідэнта Трумана, гаворачы, што «быў гэта прэзідэнт, які не баяўся прыняць пастанову».

Аднак ёсць і другі напрамак — рэалістычны. Прадстаўнікамі гэтага напрамку з'яўляюцца многія з амерыканскіх членаў Кангрэса. Характэрнымі для гэтага напрамку з'яўляюцца словы сенатара Эдварда Кенедзі, які запытаў: «Як доўга яшчэ будзем вязнямі гэтай вайны?».

РОЛЯ НАВУКІ

Навука ў жыцці савецкага грамадства адыгрывае ўсё большую ролю.

На працягу 1966—1970 гадоў у Савецкім Саюзе сканструяваны 21.272 новыя машыны, апараты і прылады. У гадах 1951 — 1955 сканструявана ўсяго 4.345 новых машын і апаратаў. Толькі ў 1971 годзе сканструявана іх 3.873.

СЛУЖБОВЫЯ АЎТАМАБІЛІ

Ужо тры месяцы таму назад у Венгрыі прынята рашэнне аб змяншэнні колькасці службовых аўтамабіляў. Да канца 1972 года 6,5 тыс. самаходаў не атрымала дазволу на «службовую эксплуатацыю» аўтамабіляў.

АМЕРЫКАНСКІ ЭКСПАРТ

Амерыканскі экспарт у Кітайскую Народную Рэспубліку ў першай палове 1972 года склаў, пералічыўшы гэта на грошы, 340 тысяч долараў, а кітайскі экспарт у ЗША — 14 мільёнаў долараў. Агульна беручы, амерыканска-кітайскі гандлёвы абарот быў у гэты перыяд амаль у тры разы большы, чым на працягу ўсяго 1971 года.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА ГДР

Сельская гаспадарка ГДР у 1972 годзе атрымала рэкордныя вынікі. У некаторых галінах дасягнуты такія высокія вынікі, аб якіх не ведае гісторыя краіны. У сярэднім плёны збожжавых культур з 1 гектара склалі 36,6 цэнтнера. Гэта абазначае, што сабрана на 0,8 мільёна тон збожжа больш, чым у мінулым годзе. Дажджы ў жніўні не дазволілі дасягнуць яшчэ лепшых вынікаў. Значныя поспехі дасягнуты ў вырошчванні бульбы і цукровых буракоў, а таксама кукурузы, кармавых буракоў і сена.

У германскай сельскай гаспадарцы безупынна змяншаецца колькасць працуючых. Ад 1950 года зменшылася яна з 2,2 мільёна чалавек да 839 тысяч у канцы 1972 года.

РУМЫНСКАЯ КАМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ...

...налічвае зараз 2260 тыс. членаў. З гэтага ліку 70 прац. гэта рабочыя і сяляне. 75 прац. членаў партыі непасрэдна працуе ў прадукцыі. (ак)

БССР

ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка за высокія дасягненні ў камуністычным будаўніцтве і ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР узнагароджана ордэнам Дружбы народаў. Гэты факт выклікаў у працоўных рэспублікі новы творчы ўздым. З усіх раёнаў і прадпрыемстваў БССР паступаюць паведамленні аб новых абавязацельствах, якімі жыхары Беларусі выказваюць сваю ўдзячнасць за высокую ўзнагароду.

ВЫСТАЎКА

У павільёнах Выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі БССР адкрыта выстаўка «Беларусь у брацкай сям'і саюзных рэспублік». На выстаўцы дэманструецца больш за 4 тысячы экспанатаў, якія даюць усебаковае ўяўленне аб буйным развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі БССР, навукі і культуры, аб росквіце талентаў і здольнасцей беларускага народа.

У НОВАПОЛАЦКУ...

...знаходзіцца нафтаперапрацоўчы завод. Ён узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Першы рабочы дзень новага года рабочыя завода сустрэлі выдатнай працай. Звыш заданняў выпрацавалі яны тысячы тон бензіну і больш як 1200 тон бітуму. Цяпер на заводзе вядуцца работы па далейшаму нарошчванню магутнасці.

АЎТАМАТЫЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ

На заводзе заточных станкоў імя 22 з'езду КПСС у Віцебску прынята ў эксплуатацыю першая чарга аўтаматызаванай сістэмы кіравання вытворчасцю. Яна будзе ажыццяўляць аператыўны ўлік паступлення камплектуючых вырабаў, разлік працоўных і матэрыяльных рэсурсаў і вырашаць шмат іншых задач. Падобныя сістэмы ўводзяцца на іншых прадпрыемствах, між іншым, у мінскім домабудаўніцтве.

ПОСПЕХ НАФТАРАЗВЕДЧЫКАЎ

Шчаслівa пачаўся новы год для нафтаразведчыкаў на Палессі. У працэсе бурэння са свідравіны Асташковіцкага месцанараджэння атрымалі другі прыток вадкага паліва з дэбітам каля 180 тон у суткі. Першы пачаў дзейнічаць у снежні мінулага года.

КАЛГАС «1 МАЯ»...

...у мінулым годзе дабіўся 27 цэнтнераў збожжавых, 190 — бульбы, амаль 280 цэнтнераў цукровых буракоў. Калгас выканаў 2 дзяржаўныя планы продажу збожжа і бульбы, намнога перавыканаў план пастаўкі буракоў.

Вельмі смелыя заданні калектыў першамайцаў намеціў на трэці год пяцігодкі. Калгаснікі абавязаліся сабраць з кожнага гектара аж па 36 цэнтнераў збожжавых, 260 —бульбы і 300 цэнтнераў цукровых буракоў.

КАМСАМОЛЬСКІЯ ПРЭМІІ

Бюро ЦК Ленінскага камсамола Беларусі прысудзіла прэміі гэтай арганізацыі ў галіне літаратуры, мастацтва, навукі, тэхнікі і вытворчасці. Між іншым, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі з'яўляецца паэт Генадзь Бураўкін. Гэтую ўзнагароду атрымаў ён за высокі ідэйна-мастацкі ўзровень вершаў і адлюстраванне ў іх маладзёжнай тэматыкі. (вр)

ПОЛЬШЧА

ПАЖАДАННІ Э. ГЕРКУ

У сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння I сакратар ЦК ПАРП Э. Герэк прыняў сардэчныя пажаданні доўгіх гадоў жыцця і поспехаў у працы для дабра Польшчы і сацыялізму ад членаў Палітбюро, Сакратарыята ЦК ПАРП, ад Прэзідыума Ўрада і ад дэлегацый з усіх ваяводстваў нашай краіны.

Свае найлепшыя пажаданні Э. Герку перадалі дзяржаўныя і партыйныя прадстаўнікі з розных краін свету.

ТАВ. Э. ГЕРЭК УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў тав. Э. Герка ордэнам Леніна. Э. Герэк унёс вялікі ўклад у развіццё польска-савецкіх адносін, у справу ўмацавання міру і сацыялізму.

ПАСЯДЖЭННЕ ПАЛІТБЮРО

3 снежня адбылося пасяджэнне Палітбюро ЦК ПАРП, на якім быў прыняты тэкст пісьма Сакратарыята ЦК і Прэзідыума ўрада да пярвічных партыйных арганізацый, канферэнцый рабочага самаўпраўлення і дырэкцый прадпрыемстваў, да рабочых калектываў усіх прадпрыемстваў. У гэтым пісьме Сакратарыят ЦК і Прэзідыум урада выказалі сардэчную падзяку рабочым калектывам, партарганізацыям, канферэнцыям рабочага самаўпраўлення, маладзёжным арганізацыям і кіраўніцтву прадпрыемстваў за іх працу, дзякуючы якой былі перавыкананы планавыя задачы і выкананы абавязацельствы, прынятыя ў рамках акцыі «20 мільярдаў злотых». Творчая праца калектываў спрыяла паляпшэнню жыцця ўсяго грамадства. Добрыя вынікі мінулага года павінны мець уплыў на дадатковую прадукцыю ў 1973 годзе.

Палітбюро разгледзела таксама прадпасылкі павелічэння выкарыстання гаручага ў нашай гаспадарцы і абмеркавала некаторыя актуальныя задачы ў галіне актывізацыі замежнага гандлю.

ПОМНІК М. НАВОТЦЫ

У сувязі з святкаваннем 30-ай гадавіны Польскай рабочай партыі ў Варшаве перад Механічным заводам імя Навоткі быў адкрыты помнік М. Навотцы, аднаму з заснавальнікаў і першаму правадыру ППР. Помнік адкрыў член Палітбюро, сакратар ЦК ПАРП Ф. Шляхціц. Адкрыццё помніка з'явілася доказам сардэчнай памяці польскага народа аб барацьбітах ППР.

РЫНАК — 1973

Міністр унутранага гандлю Э. Шнайдэр паінфармаваў, што ў гэтым годзе гандлёвыя ўстановы прададуць тавараў на 9 прац. больш у параўнанні з мінулым годам. На рынку ўзрасце на 9,7 прац. колькасць імпартаваных вырабаў. Гандаль лепш задбае аб забеспячэнні рынка вырабамі, якія карыстаюцца найбольшым попытам. Значна палепшыцца рэклама і інфармацыя аб таварах, продаж на раты і тавараў з пераацэнкі. У 1973 годзе павялічыцца колькасць крамаў, у тым ліку і тых, якія перайшлі на самаабслугоўванне.

ПАБУДОВА ХУТКАЙ ЧЫГУНАЧНАЙ МАГІСТРАЛІ

Ад 1971 года ідзе пабудова адной з найбольш сучасных у Еўропе чыгуначнай магістралі, якая спалучыць Шлёнск з Варшавай, а ў будучыні з Узбярэжжам. Зараз пабудова гэтай магістралі вядзецца на Келеччыне. (яц)

ВАЯВОДСТВА

САКРАТАР ЦК ПАРП У БЕЛАСТОКУ

4 студзеня на Беласточчыне прабываў сакратар ЦК ПАРП Е. Лукашэвіч. Ён сустрэўся з грамадска-палітычным актывам нашага ваяводства. У сустрэчы ўдзельнічалі члены сакратарыята ВК ПАРП з I сакратаром З. Куроўскім. Е. Лукашэвіч адзначыў вельмі высокую дынаміку развіцця нашай сельскай гаспадаркі. Парушаліся таксама справы развіцця беластоцкай прамысловасці.

Сакратар ЦК ПАРП наведаў «Фасты», гутарыў з рабочымі, цікавіўся вытворчасцю і сацыяльна-бытавымі ўмовамі на камбінаце, пабываў у цэхах.

ПЕРШЫЯ СЕСІІ

Ад другога да шостага студзеня па ўсім ваяводстве адбываліся першыя сесіі гмінных рад нарадовых. Новы адміністрацыйны падзел стаў правамоцным. На першых сесіях уручаны былі эрэкцыйныя акты гмін, выбраны старшыні прэзідыумаў і камісій, зацверджаны парадак і план працы на гэты год. Начальнікі гмін прадставілі праграмы дзейнасці, задачы і перспектывы развіцця гмін, а затым адбыліся дыскусіі. Асаблівая ўвага звярталася на магчымасць паляпшэння працы гаспадарчых устаноў у гмінах.

ПАДЗЯКА

5 студзеня адбылося пасяджэнне экзекутывы ВК партыі. Ацэньвалася выкананне пастаноў, прынятых экзекутывай у 1972 годзе. Са справаздачамі выступілі ўсе кіраўнікі аддзелаў. Экзекутыва ВК прызнала, што ўсе пастановы выконваліся правільна. Мінулы год быў для нашага ваяводства добрым годам. Усе планы былі выкананы, а часта і перавыкананы. Усім тым, хто сваёй старанай працай садзейнічаў таму, каб гэты год можна было ацаніць іменна так, экзекутыва ВК ПАРП выражае сваю падзяку.

ЗАКЛІК

Ваяводскі камітэт Нацыянальнага фонду аховы здароўя звярнуўся з заклікам да ўсяго нашага грамадства, да ўсіх жыхароў Беласточчыны: рабочых і сялян, інтэлігенцыі, спулдзельцаў і раменьнікаў, да жанчын і моладзі, — каб усе ўключыліся ў справу разбудовы базы, неабходнай для аховы здароўя. У закліку ёсць зварот і да прадпрыемстваў і ўстаноў, каб прымалі на сябе абавязацельствы працы грамадскім чынам на карысць аб'ектаў, якія будуюцца за грошы з Нацыянальнага фонду аховы здароўя.

У АДКАЗ НА ПІСЬМО...

...Сакратарыята ЦК ПАРП і Прэзідыума ўрада, у якім быў заклік абмеркаваць, разважыць магчымасці, па прыкладу мінулага года, даць больш вырабаў, чым прадбачвае план на 1973 год, першымі адгукнуліся рабочыя Беластоцкага прадпрыемства харчовай прамысловасці. На канферэнцыі рабочага самаўпраўлення калектыў абавязаўся даць прадукцыі на 5 мільёнаў зл. больш, чым гэта прадбачвае план на 1973 год. (яч)

TELEWIZJA WARSZAWA

Niedziela 14. I.

7.40 Program dnia. 7.45 TV Kurs Rolniczy. 8.20 „Przypominamy, radzimy”. 8.30 „Nowoczesność w domu i zagrodzie”. 9.00 Teleranek. 10.20 „W starym kinie” — „Film moją pasją”. 11.20 Reprezentacyjna Orkiestra Pomorskiego Okręgu Wojskowego w Bydgoszczy. 12.00 Dziennik. 12.10 Sprawozdawczy magazyn sportowy. 14.00 „Przemiany”. 14.30 Dla dzieci: K. Boglar — „Gucio i Cezar”. 15.20 „W obiektywie” 15.50 „Joseh Laufer i jego piosenki”. 16.20 „Piórkiem i węglem”. 16.45 „Wielka gra”. 17.40 „Samotny jak nikt” („Kobiety ich życia”). 18.35 „Tele-Echo”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Gospodynie” — film TVP (Chłopi”) odc. VIII. 20.55 PKF. 21.05 „Znasz li ten kraj” — program estradowy. 22.05 Magazyn sportowy.

Poniedziałek 15. I.

15.20 i 22.50 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Fizyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Zwierzyniec”. 17.25 „Echo stadionu”. 17.50 TV Kurier Kielecki. 18.10 „Oferty”. 18.25 Program warszawsko-mazowiecki. 18.45 „Eureka”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr TV: „Sumienie” (na motywie „Wiecznego małżonka” F. Dostojewskiego”). 21.25 Publicystyka międzynarodowa. 22.05 Dziennik. 22.25 Gra Stefan Czermak — skrzypce (laureat międzynarodowego Konkursu Skrzypcowego im. H. Wieniawskiego w Poznaniu — VI nagroda).

Wtorek 16. I.

9.05 „Gospodynie” film TVP („Chłopi”) odc. VIII. 10.00 Dla szkół: (kl. IV) „W hucie żelaza”. 10.55 Dla szkół: (kl. VI) Język polski — B. Prus „Anielka”. 11.55 Dla szkół: (kl. IV lic.) Język polski — E. Bryll — „Rzecz listopadowa”. 16.10 Program dnia. 16.15 Dziennik. 16.25 Telewizja Młodych. 17.55 „Perspektywy techniki”. 18.25 Program warszawsko-mazowiecki. 18.45 „Dzień zwykłej pracy”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Życie małżeńskie” — film franc. cz. II „Ona”. 21.55. „Ex libris”. 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.50 Radziecki program rozrywkowy.

Środa 17. I.

8.05. „Życie małżeńskie” — film franc. cz. II „Ona”. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Fizyka — „Ciśnienie w cieczach”. 10.55 Dla szkół: (kl. VII) Fizyka — „Zasada zachowania energii”. 11.55 Dla szkół: (kl. VII) Historia — „W powstańczych szeregach”. 12.45 i 13.20 Mechanizacja Rolnictwa: cz. I. i II. 14.00 „Wybieramy zawód”. 15.20 i 23.00 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Matematyka. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Latający Holender — Szkoła Jungów 2000”. 17.10 Dla dzieci: M. Kann — „Malwinka”. 17.40 „Informacje, Towary, Propozycje”. 17.55 Film. 18.25 Program warszawsko-mazowiecki. 18.45 „Poligon”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Studio 63: M. Żuławski — „Mantylka” („Opowieści mojej żony”). 20.25 „Jaqueline Bawarska” — film franc. („Słynne ucieczki”). 21.20 „Świat i Polska”. 21.55 „Antyk” — odc. IV („Balet”). 22.30 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Czwartek 18. I.

9.00 Dla szkół: (kl. I lic.) Język polski — „Poezja XVII wieku”. 9.55 Dla szkół: (kl. VI) Historia — „Przeciwko tureckim buńczukom” 10.25 „Jaqueline Bawarska” — film franc. („Słynne ucieczki”). 12.45 Dla szkół: (kl. VIII) Język polski — „Karol Szymanowski”. 14.00 Matematyka w szkole:: „Pomiary, długości, odcinki”. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Ekran z bratkiem”. 17.45 PKF. 17.55 „ZSRR-50” „Azerbejdżańska SRR”. 19.10 „Przypominamy, radzimy”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 Teatr Kobra: „Tajemnica jeziora” wg. R. Chandlera. 21.25. „Refleksje”. 21.55 „Kobiety lubią sprawiać niespodzianki” („Wieczorowy Uniwersytet dla Starszych Panów”) wg. G. Boccaccio. 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Piątek 19. I.

8.35 „Biały pokój” — film fab. bułg. 9.55 Dla szkół: (kl. I—III lic.) Wychowanie techniczne — „Łączność przewodowa”. 10.55 Dla szkół: (kl. VIII) Wychowanie obywatelskie. — „Podstawowa Organizacja Partyjna PZPR”. 15.20 i 23.25 Politechnika TV. Kurs przygotowawczy. Rysunek techniczny. 16.25 Program dnia. 16.30 Dziennik. 16.40 „Pora na Telesfora”. 17.25 „Nie tylko dla pań”. 17.45 „Gramy o telewizor”. 18.10 „Turystyka i wypoczynek”. 18.25 Program warszawsko-mazowiecki. 18.45 Magazyn medyczny. 19.20 Dobranoc. 19.30 Dziennik. 20.05 „Minuta grozy” — film NRF. 20.30 „Panorama Tygodnia”. 21.10 Teatr TV na świecie: W. Szekspir — „Wieczór Trzech Króli”. 22.25 Dziennik. Wiadomości sportowe.

Sobota 20. I.

7.50 „Kto sieje wiatr” — film fab. USA. 9.55 Dla szkół: (kl. VII) Zoologia — „Świat owadów”. 10.55 Dla szkół: (kl. VIII) Nauka o człowieku — „Układ krwionośny”. 11.55 Dla szkół: (kl. VIII) Geografia — „Chile”. 15.25 Program dnia. 15.30 Program I proponuje. 15.50 Redakcja Szkolna zapowiada. 16.05 Telereklama. 16.30 Dziennik. 16.40 Program dla młodych widzów. 18.00 „Bieg po zdrowie”. 18.30 „Godzina Orfeusza”. 19.20 Dobranoc. 19.30 Monitor. 20.15 „Wielka Rewia na Karowej”. 21.25 Dziennik. Wiadomości sportowe. 22.05 „Kto sieje wiatr” — film fab. USA.

ТЭЛЕВІЗІЯ МІНСК

Piątek, 12 stycznia

10.35 Filmy dokument. 14.15 Spektakl dla uczniów. 16.30 Mistrzostwa ZSRR w jeździe figurowej na lodzie. 20.00 Teatr miniatur. 21.30 Nasi goście: W. Malinin.

Sobota, 13 stycznia

10.40 Przegląd międzynarodowy. 11.40 Spotkanie literackie. 14.00 Koncert zespołu „Żok”. 15.00 Film animowany. 16.10 Film dokument. 17.30 Film fab. 19.30 Mistrzostwa ZSRR w jeździe figurowej na lodzie.

Niedziela, 14 stycznia

8.00 Reportaż z wystawy. 8.30 Kiosk muzyczny. 10.00 Filmy animowane. 10.30 Dla żołnierzy. 11.00 Film fab. 13.00 Nowe wiersze M. Tanka. Czyta autor. 13.15 Konkurs młodych piosenkarzy. 15.00 Klub filmowy. 17.00 Mistrzostwa ZSRR w jeździe figurowej na lodzie. 20.00 Koncert. 20.55 Tańczcie z nami.

ШТО МОЖА БАЦЬКОЎСКІ КАМІТЭТ?

У асяроддзі настаўнікаў і работнікаў органаў асветы вельмі часта і многа гаворыцца аб ролі бацькоўскага камітэта ў школе. І меркаванні выказваюцца розныя: адны сцвярджаюць, што добра наладжаная праца з бацькамі прыносіць вялікую карысць у выхаваўчай і навучальнай працы школы, іншыя доказваюць: бацькоўскі камітэт — гэта толькі дадатковая праца дырэктару і выхавацелям, а вынікі яе мізэрныя.

Паставіўшы сабе пытанне «Што на самай справе можа бацькоўскі камітэт у школе?», я накіраваўся шукаць адказу на яго ў пачатковую васьмігадовую школу ў Дубінах, Гайнаўскага павету.

Дубінаўская школа невялікая: 146 вучняў, 9 настаўнікаў, старэнькі, але добра дагледжаны будынак, багатае забеспячэнне навучальнымі дапаможнікамі. Вынікі ў выхаванні і навучанні вельмі добрыя. Сярод 24 выпускнікоў школы з мінулага года 5 паступіла ў агульнаадукацыйныя ліцэі, 2 — у тэхнікумы, 12 — у засадніцыя прафесіянальныя школы, 3 — у засадніцую сельскагаспадарчую школу і толькі двое засталося дома. І гэтак з году ў год. Дырэктар школы і настаўніцкі калектыў у Дубінах вельмі дбайны, працавіты і патрапіць прышчапіць дзецям любоў да працы, навукі, салідарнасці ў жыцці.

Аднак не толькі ў працы дырэкцыі і настаўніцкага калектыву з дзецьмі крыецца залог добрых вынікаў. Тут выхавацелі паасобных класаў на чале з дырэктарам Яўгенам Гарустовічам патрапілі арганізаваць і сістэматычна весці працу з бацькоўскім камітэтам. Мерапрыемствы, якія праводзіць школа разам з бацькамі, вельмі падрабязна і рэальна плануюцца, і дырэктар строга сочыць за іх выкананнем. Пачынаецца праца з прадуманага выбару бацькоў у класныя тройкі. Старшыняў троек школа сістэматычна запрашае на пасяджэнні педагагічнага савета, а бацькоў — на ўрокі.

Штогод школа вядзе універсітэт для бацькоў з багатай і разнастайнай праграмай, у якой дамінуюць усё ж праблемы, звязаныя з навукай і выхаваннем дзяцей. Класныя тройкі разам з выхавацелямі рэгулярна наведваюць сем'і, з якіх паходзяць вучні, клапатлівыя ў выхаванні. Быў нават такі выпадак, што тройка хацела падаць у пакаральна-адміністрацыйную калегію на бацьку, які не апекаваўся сваім вучнем — сынам. І памагло!

Бацькоўскі камітэт дапамагае школе арганізаваць адпачынак вучняў: вечарыны, ёлкі, кулікі ў пушчу, экскурсіі па краіне. У мінулым годзе на экскурсію па маршруту Варшава—Кракаў—Закапанэ—Асвенцім разам з дзецьмі паехала шмат бацькоў. І пагляддзелі шмат, і настаўнікам дапамаглі ў апецы над вучнямі.

У асенне-зімовы перыяд бацькоўскі камітэт у школе ў Дубінах штодзень арганізуе другое снеданне. Карыстаюцца з яго ўсе дзеці. А каб да шклянкі малака і кавы была булачка з маслам ці вяндлінай, бацькі штогод арганізуюць дахадовыя забавы. Так, напрыклад, забава, арганізаваная 21 верасня гэтага года, дала 5.475 злотых. Сума нядрэнная!

Усе справы, звязаныя з раздзелам стыпендый і іншай матэрыяльнай дапамогай для незаможных вучняў тут вядзе бацькоўскі камітэт. Калі не хапае дзяржаўных сродкаў, звяртаецца ён і да дабравольных складчын. Ды не толькі. Доўгі час бацькі апрацоўвалі ладны кусок зямлі з ПФЗ, сеялі гарох, садзілі бульбу, а выручку кіравалі на патрэбы школы. І зямля аблогам не ляжала, і школе вялікая дапамога.

Любіць бацькоўскі камітэт у дубінаўскай школе пахадзіць і пры школьным будынку: дагледзець, адрамантаваць, а то і пабудаваць што-небудзь. Нядаўна ў грамадскім чыне пабудаваў ён спецыяльны павільён 32 × 5 м для майстэрні па тэхнічнаму выхаванню і кабінета заняткаў па хатняй гаспадарцы. Павільён ацэнен у 204 тысячы злотых, у тым ліку 102 тысячы злотых — гэта сродкі, матэрыялы і праца бацькоў.

Найбольш актыўныя і ахвярныя члены бацькоўскага камітэта ў Дубінах — гэта Ян Юрчук, Мікалай Аўэрчук, Ян Вошчанка і шэраг іншых. Узначальвае яго Сяргей Койла. Душа ж камітэта — не будзем таіць — дырэктар школы Яўген Гарустовіч.

І так, адказ на пастаўленае пытанне ёсць гатовы: многа, вельмі многа можа зрабіць добрага бацькоўскі камітэт у школе!

Мікалай Гайдук

ФЁДАР ПРЫСТУПЮК

ЛЮДЗІ ДОБРАЙ РАБОТЫ



Больш 20 гадоў нязменна працуе Фёдар Прыступюк ў кацельнай Прадпрыемства сухой дыстыляцыі драўніны ў Гайнаўцы. Праца тут нялёгкая, патрабуе вялікага фізічнага напружання. Печы трэба тапіць бесперарыўна цэлыя суткі, тэмпература ж увесь час павінна быць аднолькавая. Аднак Фёдар Прыступюк свае абавязкі выконвае пасяхова. Сам загадчык кацельнай Юзэф Суравой хваліць свайго падначаленага за яго добрасумленнасць і дысцыпліну.

Фёдар Прыступюк закончыў у гэтым годзе пачатковую адукацыю і намераны паступаць вучыцца далей. Мае ён сваю ўласную багатую бібліятэку і ў вольныя хвіліны многа чытае. Здаўна збірае ён паштовыя маркі і мае іх поўныя калекцыі.


Тэкст і фота Я. Цялушэцкага

НА НІВЕ БГКТ

БАБСКАЕ АДРАДЖЭННЕ

Высокая шчуплая жанчына. Прыгожы смуглявы твар. Вялікія жывыя вочы. Цёмныя, гладка зачэсаныя валасы.

Калі пачынае расказ аб тым, як у іх пачалася праца на ніве БГКТ, то міжволі прыкоўвае ўвагу. Словы плывуць складна, цікава, дасціпна. Расказ свой перапынае фрагментамі ўласных песень, прымаўкамі. Завецца Анна Стафіюк і жыве ў вёсцы Трасцянцы. Рана выйшла замуж, ужо пагадавала дзяцей — чатырох сыноў і дачку.



Анна Стафіюк.

Калі дайшлі да Трасцянкі папулярныя беларускія песні, Анна спявала пра раку Нёман. І падумала: чаму наша Нараў, якая плыве за вёскай, мае быць горшай ад Нёмана? Няхай і Нараў мае сваю песню. І так Стафіюк склала песню пра Нараў:

«Ой, рэчка шумлівая Нараў,
Ты блізка Трасцянкі плывеш,
Красуешся траўкай зялёнай
І шчасце, і радасць нясеш».

Далей песня расказвае аб тым, што воды з Нарвы заплываюць аж у сталіцу Варшаву, а ў час акупацыі гэтыя чыстыя воды паілі партызанаў.

Напяваючы сваю «Рэчку Нараў», Анна ўспомніла колішняе. Было іх у бацькі 6 дочак. Жывуць чатыры. Цяжка было, бедната. І пастанавіла Анна паказаць колішняе жыццё на сцэне, «каб бачылі».

У вершаванай форме Анна Стафіюк можа перадаць любое здарэнне. Мае жанчына талент, няма што казаць. Вось прыклад на водгук уласных перажыванняў, адна песня-быль з жыцця: першая частка песні расказвае аб тым, як хочуць аддаць дзяўчыну за шляхцюка, а ў другой частцы дзяўчына востра супраціўляецца:

Над рэкою быстрай, (2 разы)
Блізко пэрэлазу, расцвіла каліна.
Пусці, моя маті, полотно біліті,
Коб почуті голос зозуліны.

Іді, моя доню, іді, моя міла,
Іді, но нэ бойся,
Як прыедэ шляхтіч вэлікого роду,
Коб на тэбэ вон нэ крывдовався».

Але дзяўчына горда адказвае:

«Нэ пуйду, нэ пуйду,
Нэ пуйду за пана!»

Гэтыя і іншыя песні вучылі бабы з вёскі Трасцянкі. І так скрышталізавалася ў вёсцы новая цікавая форма працы: інсцэнізацыя песень ці, інакш кажучы, прадстаўленне на аснове песні. Песня дзеліцца на ролі, адпаведна выбраныя асобы апранаюцца ў касцюмы і кожны спявае сваю частку. Хор, бывае, выступае ў ролі публічнай апініі, або як фон. Гэтак яны ў Трасцянцы ставілі многа песень. Песні Анны і яшчэ абрадавыя, «жыцейскія» на базе колішняга жыцця. Інсцэнізавалі песню пра трох казакоў і вядомую «Ой хацела мяне маць», прывітальныя прыпеўкі Віктара Шведа і многа іншых.

Праца праводзіцца ўжо некалькі год у Трасцянцы. Усё сіламі жанчын, якія ўвасабляюцца ў любую ролю. Ёсць тут бабы, умеючыя прадставіць кожную постаць: салдата, дурня, п'яніцы і іншых.

Вельмі спявучыя дзве Анны — Анна Стафіюк і Анна Максімчук. Насця Богуш добра іграе. «Каб вы бачылі, як яна прадставіла жыда»! Каця Грыгарук — найстарэйшая ў калектыве (ёй 60 год!) і ўсё дабіваецца сваёй ролі, духу паддае бабам. Агата Трафімюк вядомая з ролі марака, Соня Сцепанюк стварыла дасканалую ролю ксяндза. Слаўнымі ў вёсцы трыма казакамі былі Марыя Грыгарук, Соня Сцепанюк і Насця Грыгарук. Анна Стафіюк — галоўны герой у трасцяніцкім калектыве, так ацэньвае іх: «Усе здоровы бабы, файны, ніхто нэ познаў, як выйшлі на сцэну, ніхто нэ думаў, што бабы могуть быті так подобны до козаков».

Інсцэнізацыя і ўборы ў Трасцянцы рыхтуюцца ўласнымі сіламі і сродкамі. І найбольш у гэтым здольна сама Анна Стафіюк, якая з'яўляецца не выбіраным, але фактычным кіраўніком, рэжысёрам і арганізатарам працы. Як цёпла гучыць маленькі расказ пра кудзельніцу: «Лоні ў рочніцу БГКТ зрабілі мы вечарніцу. Клуб прыбралі па-калісьняму, ў ручнікі. У два рады пасадалі бабы і спявалі «Чэраз рэчэньку, чэраз быструю». Пабіраліся ў белыя блузкі і фартушкі, у саяны. На галавах чырвоныя хустачкі. Спяваючы і падтанцоўваючы, выконвалі розныя работы.

Другая галіна бабскай дзейнасці ў Трасцянцы — гэта пастаноўкі п'ес. Ставілі «Пробу агнём» Крапівы, ставілі п'есы, адаптаваныя самой Аннай Стафіюк для іхняй сцэны. Анна многа чытае. І няхай спадабаецца ёй нейкае апавяданне, зараз зробіць з яго п'есу. Мяркуе падрыхтаваць п'есу з пасляваенных год, прыдзе тады моладзь у калектыў, якая часта звяртаецца да Анны: «Тёто, робетэ што, то мы прыдэмо до вашого зэсполу». Калі не знойдзецца такая п'еса, падрыхтуе Трасцянка нешта з уласнага жыцця. «От, якогось п'яніцу пакажам, які здзекуецца над жонкай».

І так даходзім да канца нашага расказу з вёскі Трасцянкі, дзе на вышыню ўзняліся жанчыны і кіруюць тут культурнай працай. Штуршок ёй далі і навучылі жанчын арганізаванай культурнай працы доўтагадовыя настаўніцы мясцовай школы — Гэлена Тапалянская і Надзя Савіцкая. Пра іх заслугі і дапамогу гаворыцца ў вёсцы цёпла і з пашанай.

Многа ёсць вялікіх талентаў у Трасцянцы. Мы не ўсіх назвалі. Але найлепш гэта акрэсліла сама Анна Стафіюк: «Няма нікога ў вёсцы, каб адказаўся, калі трэба».

Вера Леўчук

Этнаграфічнае акенца



Вёска Залукі Беластоцкага павету. *Фота Я. Цялушэцкага*

Закончыўся конкурс ТППР

Закончыўся конкурс Ваяводскага праўлення ТППР у Беластоку на ўспаміны аб пабыўцы ў СССР. Сёлетні конкурс быў прысвечаны 50-ай гадавіне СССР. Журы ацаніла прысланыя працы і прызнала 3 ўзнагароды. І узнагарода — паездка ў СССР, для якой ВП ТППР дае 2 тыс. зл. Атрымаў яе Уладзімір Скаржынскі з Высокага Мазавецкага. Яго ўспаміны датычаць пабыўкі ў Мінску і Маскве. Гэта ўспаміны былога салдата, які дарогу, якую цяпер праязджае поездам, праходзіў калісьці з фронтам. Вяртаючыся ў 1944 годзе інвалідам на Радзіму, ішоў той жа дарогай па знішчанай краіне. Цяпер бачыць краіну адбудаваную. Бурліць яна жыццём і родзіцца ў былога салдата гордасць за людзей, якія так хутка зацерлі сляды вайны.

II узнагарода была прызнана Станіславе Дануце Карпінскай з Беластока, якая прыслала ўспаміны з пабыўкі ў Вільне. Цудоўны і багаты горад і той стары і той новы, які разрастаецца ўсё новымі дамамі. Аўтар дае багаты інфармацыі пра Вільна ў гістарычнай рэтраспекцыі. Успамінае аб міжнародным характары горада даўней і цяпер. Успамінаючы пра слаўных людзей, якія жылі ці працавалі ў Вільне, называе таксама Янку Купалу і Якуба Коласа.

III узнагароду атрымала Барбара Пашкоўская са Шчучына ў Граеўскім павеце. Успаміны яе датычаць даволі доўгай пабыўкі ў Ленінградзе, у дзядзькі прафесара, які памёр на дзень перад яе прыездам. Аўтар ходзіць па слаўным горадзе белых начэй не працертымі сцежкамі турыстаў, а сваімі ўласнымі. На кожным кроку сустракае факты і людзей, якія напаўняюць аўтара радасцю і гонарам.

Працы на конкурс прыйшлі з вельмі многіх мясцовасцей ваяводства. Агульны ўзровень конкурсу высокі. Трэба сказаць, што вопыт Ваяводскага праўлення ў Беластоку па арганізацыі конкурсаў на ўспаміны аб пабыўцы ў СССР у 1972 годзе пераняў тыднёвік «Пшыязнь», які аб'явіў уласны конкурс такога ж роду. Вынік яшчэ невядомы. Але варта, каб «Пшыязнь» штогод аб'яўляла гэтыя конкурсы. (вл)

Мясцовыя дарогі ў Бельскім і Гайнаўскім паветах

Гаспадаркай на мясцовых дарогах паасобных паветаў кіруюць павятовыя праўленні мясцовых дарог. У Бельскім і Гайнаўскім паветах, так як і ў іншых паветах Беластоцкага ваяводства, большая частка дарог — гэта мясцовыя дарогі.

У Беластоцкім ваяводстве больш 60% таварнай масы перавозяць аўтамабільным транспартам. Таму менавіта мясцовыя дарогі з'яўляюцца настолькі важнымі; тым больш, што развіваецца матарызацыя, павялічваюцца перавозкі і развіваецца сельская гаспадарка.

Да гэтага часу ў Бельскім і Гайнаўскім паветах пабудавана шмат дарог, а між іншым: Бельск Падляшскі — Орля —Рутка, Пульшы—Страбля, Бранск—Гадышэва—Тапчэва і Орля—Зубава ў Бельскім павеце; Дубічы Царкоўныя—Збуч—Клейнікі—Градочна, Гайнаўка—Дубічы Царкоўныя—Орля, Кляшчэлі—Палічна, Дубічы Асочныя—Ласінка—Тыневічы, Нараўка—Масева, Альхоўка—Семяноўка—Лука ў Гайнаўскім павеце.

Гэтыя сур'ёзныя дасягненні Гайнаўскага павету атрыманы дзякуючы самаахвярнасці дарожнай службы і ўсяго грамадства, а асабліва жыхароў вёскі. Неабходна таксама падкрэсліць тут фінансавую дапамогу дзяржавы.

Разам з разбудоўваннем сеткі мясцовых дарог прыводзіцца ў дзеянне ўсё больш ліній аўтобусаў ПКС.

Планы павятовых праўленняў мясцовых дарог ахопліваюць задачы да 1990 года.

У 1973 годзе ў Бельскім павеце будзе пабудавана дзесяць мясцовых дарог, на трох участках будуць мадэрнізаваны цвёрдыя дарогі, будуць адноўлены 2 цвёрдыя дарогі, а таксама палепшаны грунтовыя дарогі. У Гайнаўскім павеце ў той жа час будзе пабудавана 9 мясцовых дарог, будуць мадэрнізаваны дзве цвёрдыя дарогі, адноўлена адна дарога і таксама будуць паляпшацца грунтовыя дарогі. Павятовае праўленне мясцовых дарог у Бельску і Гайнаўцы таксама будуе, мадэрнізуе і рамантуе масты. Мэта гэтага — пабудаваць добрыя спалучэнні паміж вёскамі, гмінамі і суседнімі паветамі.


Да гэтага часу гаспадарчая дзейнасць павятовых праўленняў мясцовых дарог у Беластоцкім ваяводстве фінансавалася з наступных крыніц: з фонду на мясцовыя дарогі і масты, з грошай, прызначаных на інвестыцыі і капітальныя рамонты, са сродкаў грамадскага фонду, з фонду ПЗУ, з бюджэтных надвышак рад нарадовых, з удзелу іншых адзінак у коштах будовы мясцовых дарог і мастоў, з укладу насельніцтва ў рамах грамадскіх дарожных чынаў.

Частковая змена фінансавання ў галіне будовы дарог пасля ўтварэння гмін зробіць пазітыўны ўплыў на развіццё мясцовых дарог. У бліжэйшыя гады дарогі будуць будавацца ў рамках інвестыцыйных дарожных чынаў пры фінансавай дапамозе дзяржавы і гміннага фонду, многае таксама залежыць будзе ад актыўнасці мясцовага насельніцтва.

Выкананне такіх сур'ёзных задач, намечаных у плане, будзе магчыма толькі пры максімальным і ўсебаковым выкарыстанні мясцовых сродкаў і мабілізацыі насельніцтва на грамадскія дарожныя чыны, пры выкарыстанні ўсялякай грамадскай ініцыятывы, самаахвярнасці дарожнай службы і неабходнай фінансавай дапамогі дзяржавы.

Алойзы Даковіч

Клуб „РУХ" у Залуках



Ірэна Паплаўская.

Яшчэ ў 1971 годзе толькі некаторыя верылі ў тое, што ў вёсцы Залукі Беластоцкага павету будзе адкрыты клуб «Руху». Аб клубе ў сваёй вёсцы марыла перш за ўсё моладзь. Павятовыя ўлады прадпрыемства «Рух» адкрылі ў пачатку г.г. клуб у будынку мясцовай рамізы. Праз месяц у клубе паявіўся тэлевізар. Новыя столікі і крэслы, а таксама іншае абсталяванне было дастаўлена адразу. Працу ў клубе пачала Ірэна Паплаўская, якая ў першыя ж дні існавання клуба арганізавала чытанне цікавых кніжак, а таксама дэманстрацыю каляровых казак для дзяцей. Для жанчын былі арганізаваны лекцыі на тэмы асабістай гігіены і здароўя. Моладзь, арганізаваная ў гуртках БГКТ і ЗМВ, наладзіла вечарыну, прысвечаную вялікім беларускім пісьменнікам Я. Купалу і Я. Коласу, дэманстрацыю савецкіх кінафільмаў, сустрэчы з ЗМС-аўскай моладдзю з Эканамічнага тэхнікума ў Беластоку, акадэміі. У клуб пачала прыходзіць моладзь з суседніх вёсак. Найбольш збіралася на тэлевізійны "дзённік" і на цікавыя кінафільмы, на танцавальныя вечарыны, або пачытаць свежую прэсу. Кіраўнічка клуба Ірэна Паплаўская пачала шырэй прапагандаваць падпіску на газеты, а ў тым ліку і на «Ніву».

На многа культурней пачала весці сябе моладзь. Вельмі добра, што цяпер мае яна дзе сустрэцца. Напэўна нарадзіцца ахвота паспрабаваць сваіх сіл і ў мастацкай самадзейнасці. Кажуць, што спробы ўжо былі. І гэта нас цешыць.

Тэкст і фота Я. Цялушэцкага



SLAVIA

У раздзеле «Крытыка і даклады» трэцяга нумара часопіса «SLAVIA» з 1972 года змешчан агляд вядомага чэшскага беларусазнаўца Міколаша Затаўканюка — «Беларуская лексікалогія ў пяцігоддзі 1965—1970».

Ва ўступнай частцы свайго агляду аўтар даў характарыстыку беларускай лексікалогіі ад канца дваццатых гадоў («Віцебскі краёвы слоўнік», «Краёвы слоўнік Чэрвеньшчыны»). У гадах 1919—1935 паявілася каля 50 слоўнікаў, якія датычылі таксама беларускай тэрміналогіі ў розных галінах навукі і тэхнікі.

Шмат увагі аўтар агляду прысвячае слоўнікам Бялькевіча, Сцяцко, Жыдовіч, якія выйшлі з друку ў 1970 годзе, і Юрчанкі (Мінск 1966). Падкрэсліваецца багацце слоўнікавых выданняў Янкоўскага, Судніка, Кісялеўскага.

Высока ацэнены даследаванні М. Бірылы («Беларуская антрапанімія»). Чэшскі вучоны лічыць, што дзякуючы фундаментальным даследаванням Бірылы беларускае мовазнаўства дасягнула перадавой пазіцыі ў славянскай антрапаніміі. Характарыстыцы даследавання выдатнага беларускага вучонага прысвяціў ён асобны падраздзел свайго агляду.

З вялікім зацікаўленнем піша Затаўканюк пра дзейнасць і творчыя здабыткі А. Супруна, сурэдактара «Актуальных проблем лексикологии», зборніка з багатай тэматыкай.

Шкада, што здабыткі беларускіх вучоных мала вядомы за мяжою, адзначае чэшскі вучоны ў заканчэнні агляду.

Сакрат Яновіч

Прыкладны пісьманосец

Ураджэнец Мацейкавай Гары (Беластоцкі павет) Кастусь Нос ужо дванаццаць гадоў працуе пісьманосцам на пошце ў Юшкавым Грудзе. Абслугоўвае ён даволі вялікі раён, між іншым, такія вёскі, як Бяндзюга, Сушча, Калеснае, Круглы Лясок, Польска, Супруны. Штотыдзень даручае ён таксама падпісчыкам наш беларускі тыднёвік «Ніва». Найбольш — у вёску Бяндзюга. Сяляне з яго раёна выпісваюць таксама шмат часопісаў на сельскагаспадарчыя тэмы: «Грамада — рольнік польскі», «Малады селянін», «Плён», «Аграхімія» і іншыя.

Кастусь Нос абавязкі свае выконвае паспяхова. Штодзень на матаролеры праязджае не менш 28 кіламетраў, каб тэрмінова даручыць усе пасылкі. Пра яго саліднасць у выкананні прафесіянальных абавязкаў прыемна нам было пачуць многіх жыхароў вёсак, якія абслугоўвае паштовая ўстанова ў Юшкавым Грудзе.

Тэкст і фота Я. Цялушэцкага



ПАСЛУГОВА — ВЫТВОРЧАЯ СПУЛДЗЕЛЬНЯ

Побач з прамысловасцю і будаўніцтвам, сельскай і лясной гаспадаркай галіна паслуг дае працу вялікай колькасці людзей. Развіццё паслугаў мае вялікі ўплыў на ўмовы быту, а таксама на прадукцыйныя ўмовы ў нашай краіне. Асаблівае значэнне маюць рамонтна-будаўнічыя паслугі. Новая арганізацыя гмін павінна і будзе спрыяць развіццю паслугаў у малых мястэчках.

У Нарве на Гайнаўшчыне разбудоўваецца цяпер паслугова-вытворчая спулдзельня, дзейнасць якой звязана з вёскай, з сельскагаспадарчымі гурткамі. Прадукуе яна будаўнічыя матэрыялы: пустакі, стаўбы да агароджы, ходнікі, трэлінку, інспектавыя вокны. Спулдзельня займаецца таксама рамонтамі дамоў. Ёсць тут свая сталярня, таму спулдзельня можа выконваць нетыповыя паслугі.

Вельмі істотным у дзейнасці спулдзельні з'яўляецца яшчэ будова гаражоў для сельскагаспадарчых гурткоў і загаспадаранне баз машынна-трактарных станцый (МВМ).

(мх)



ПЕРЫЯД XIX СТАГОДДЗЯ

АДАМ ГУРЫНОВІЧ — ЧАСТКА II

Пераклады Гурыновіча з рускай і польскай моваў на беларускую мову нешматлікія. Пераклаў ён усяго некалькі вершаў: А. Пушкіна — «Рэха», Някрасава — «Мароз — чырвоны нос» (фрагмент), А. Талстога — «Вясна», А. Міцкевіча — «Валле», Я. Каспровіча — «Вясна» і твор Э. Ажэшка — «З часоў голаду». Можна было б мець прэтэнзіі і да мастацкага боку перакладаў Гурыновіча. Не валодаў ён беларускай мовай у той ступені, што Багушэвіч ці Лучына, і гэты факт не застаўся без следу на стылістыцы яго перакладаў.

Найбольш цікавай з'яўляецца арыгінальная творчасць Гурыновіча. Творчасці гэтай не было суджана ўбачыць свет пры жыцці аўтара. Гурыновіч — тыповы сын беларускага лёсу — не мог цешыцца вынікам сваёй творчай працы. Пры жыцці паэта вершы яго не з'явіліся ў друку. Пісаў, значыць, «не для справы і багацця», пісаў, бо так загадвала яму сэрца.

Калі пачаў пісаць Гурыновіч? Мяркуюць, што яшчэ ў перыяд прабывання ў сярэдняй школе. Несумненна, пісаў таксама ў студэнцкія гады.

Мы ўжо сказалі, што беларускі фальклор быў адной з прычын зараджэння арыгінальнай творчасці Гурыновіча. Шукаючы іншых прычын, якія ўплывалі на развіццё творчасці Гурыновіча, трэба звярнуць увагу на творчасць беларускіх пісьменнікаў XIX ст., а перш за ўсё на паэзію Багушэвіча. Значэнне ўплываў Багушэвіча (Мацея Бурачка) падкрэсліў сам Гурыновіч у адным з сваіх вершаў

«Дзякуй Табе, браце, Бурачок Мацею,
За тое, што ў сэрцы збудзіў ты надзею,
Што між братоў нашых знаходзяцца людзі
З кахаючым сэрцам і баляшчай грудзяй.
Дзякуй табе, браце, і за тыя словы,
Што ўспомнілі звукі нашай роднай мовы».

Словы верша маюць глыбокі сэнс. Дасканала характарызуюць той цяжкі шлях, якім ішла большасць беларускіх пісьменнікаў у літаратуру. Пісьменнікі гэтыя мусілі пераадолець цяжкасці, з якімі не сустракаліся ні пісьменнікі рускія, ні пісьменнікі польскія, ні аўтары іншых народаў. Літаратурай у XIX ст. займалася, як правіла, шляхта. Шляхта ў Беларусі ў XIX стагоддзі была амаль поўнасцю каталіцкай і спольшчанай. Не было ў той час апрацаваных граматычна і навукова норм беларускай мовы. Колькі ж трэба было пачуцця, добрай волі, імкнення, каб пачаць пісаць на мове беларускага люду. Як жа шляхціц Гурыновіч мусіў нізка ўпасці ў вачах прадстаўнікоў шляхты, для якіх культура атоесамлівалася толькі і выключна з мовай суседзяў. Гурыновіч пайшоў іншым шляхам, шляхам, які падказала яму сэрца, родная зямля, зямля, беларускі народ.

Досыць цяжка акрэсліць размеры творчасці Гурыновіча. Беларускі даследчык С. Майхровіч спасылаецца на сцвярджэнне царскага чыноўніка, які вёў следства ў справе Гурыновіча. З гэтага сцверджання вынікае, што паліцыя затрымала восем сшыткаў з творчасцю Гурыновіча. На жаль, сшыткі аб якіх гаворыць чыноўнік, не знойдзены. Але зусім магчыма, што колькасць вершаў, напісаных Гурыновічам, не была вялікай. Ці ж мог напісаць многа юнак, які пражыў усяго 25 гадоў, які быў студэнтам, а апрача таго дзейнічаў у вядомым нам гуртку моладзі? Напэўна не.

Да нас дайшло больш дваццаці вершаў Гурыновіча. Якраз яны ствараюць карціну ўнутранага свету паэта. У патычным светапоглядзе Гурыновіча сышліся ў адну цэласць рамантычныя, народніцкія і крытычна-рэалістычныя элементы. Паэзія Гурыновіча — гэта паэзія грамадскага накалу. Была яна вынікам болю паэта, выкліканага нядоляй беларускага народа. Ідэолагам, заступнікам, абаронцам гэтага люду лічыў сябе Гурыновіч. Гэта якраз і акрэсліла змест яго паэзіі. У творчасці Гурыновіча дамінуюць два моманты: грамадскі і прыродаапісальны. Зрэшты, прыродаапісальны элемент найчасцей падпарадкаваны справам грамадскім.

Еднасць чалавека з прыродай найлепш падкрэслена ў вершы «Бор».

«Ох ты, бор мой, бор,
Бор сасновенькі!
Ты з каторых пор
Шуміш, родненькі?
Мы з табой раслі,
Уздымаліся.
На адной зямлі
Гадаваліся...
А з табой у нас
Долі роўныя;
Мы з табой якраз
Браты родныя.»

Прыкладам грамадскай энергіі можа быць верш «Што за звук ды так моцна раздаўся», у якім Гурыновіч далучае свой стогн да стогну ўсенароднага.

«То ўвесь наш народ гэтак стогніць
Над нешчаснаю доляй сваёй».

У многіх вершах Гурыновіча паяўляюцца заклікі да згуртавання, да калектыўнага дзеяння, да працы на карысць нацыянальнага і сацыяльнага адраджэння.

Паэтычная жар-птушка Гурыновіча не развярнула поўнасцю сваіх крыл, не ўзнялася над гняздом, не даляцела пры жыцці аўтара да тых людзей, у імя якіх была створана. Паэт не дачакаў публікацыі сваіх твораў. Ці ж у гэтым не заключаецца драма і паэта, і нацыі, да якой ён належаў?

© PDF: Kamunikat.org 2023

СВАЁ І ЧУЖОЕ

«Вялікае шчасце мець добрага, людскага суседа. Зразумець гэта можа толькі той, хто мае за плотам сапраўднага ворага.

Вось, напрыклад, сусед маёй знаёмай з вёскі П., што на Бельшчыне. Быў сусед як сусед. І раптам аказалася, што яго добрасуседскія адносіны пераламаў звычайны бярозавы кій, а дакладней кажучы, бярозавы сук.

Неяк раптам у маёй знаёмай пачала псавацца электрычнасць. Паклікалі майстра, направілі, а праз хвіліну святло зноў згасла. Майстар-электрык пайшоў шукаць прычыны. І вось тут аказалася, што прычынай была галіна суседавай маладой бярозкі. Яна занадта вырасла і датыкалася да дроту, робячы кароткае замыканне.

Электрык, нікога не пытаючы (пэўна, не спадзяваўся, што нехта можа не пазволіць), абрэзаў гэты бярозавы сук. Суседзям гэтая справа не спадабалася. Гаварыць перасталі да знаёмай, але маўчалі.

Аднак бярозка расла. І новая галіна дацягнулася да дроту. Святла ў гэтай хаце зноў не стала.

Аж тут, невядома на чыё шчасце, а на чыё няшчасце, прыехала ў вёску электраінспекцыя. Яе заданне — пільнаваць парадку і бяспекі ў электрычных справах. Інспекцыя ўбачыла бярозку, якая цягнецца да электрычных правадоў, і, не пытаючы гаспадара-суседа, зрэзала яе да пня.

Але сусед не даходзіў права. Ён адразу зразумеў, чыя гэта «спраўка». Вядома, гэта той суседцы яго бярозка не падабаецца! Яна можа нават зайздросціць, што сусед такую мае. Якая яму справа да таго, што з-за яго бярозкі нехта за плотам сядзіць без святла!

Разбушаваліся гаспадары бярозкі. Вырашылі не даравацъ. Падпільнавалі, калі суседка (а яна была настаўніцай) паявіцца з групай дзяцей, (сведкі павінны быць, бо інакш — што гэта за сварка) і наляцелі на суседку з крыкам:

— Ты такая, ты гэтакая, бярозка табе перашкаджала?! Ты на сябе паглядзі! Каб цябе так, ды гэтак...

І пасыпалася, і пасыпалася... Прыпомнілі настаўніцы яе былыя і небылыя грахі, высылалі яе туды, адкуль яшчэ ніхто не вярнуўся, «зычылі» найбольшых громаў і бед на яе галаву. Не пераймаліся тым, што іх слухаюць дзеці. («А што там дзеці, няхай ведаюць!»).

Што ім аўтарытэт ці звычайны чалавечы гонар настаўніцы, выхавацелькі іх дзяцей! Яна ж пасягнула на іх уласнасць!

Злосць залівала суседзям вочы і розум. І каб трапілі так на падобных сабе суседзяў, бойкі было б не мінаваць. Магло б і да суда дайсці. Але трапілі на спакойнага, разумнага чалавека. Настаўніца змаўчала, сцярпела. Толькі да болю крыўдна было за такога чалавека, за беспадстаўную абразу перад людзьмі, перад дзецьмі. Не думала, не спадзявалася, што за столькі год працы ў вёсцы заслужыла такую «падзяку». І ўсё з-за адной бярэзінкі! *Я. Чэрнякевіч*

Звальненні ад ураўняльнага падатку

Закон аб ураўняльным падатку ахоплівае таксама некаторыя спецыялістычныя галіны сельскагаспадарчай прадукцыі. Напрыклад, падаткам не ахопліваецца толькі пэўны арэал гародніны і фруктаў, а калі вызначаны законам арэал перавышан (пасадка цыбулі, трускалак, саду), трэба плаціць спецыяльны ўраўняльны падатак.

Аднак Ваяводская рада народовая прыняла пастанову з 9 снежня 1972 года аб звальненні ад ураўняльнага падатку некаторых спецыялістычных галін сельскагаспадарчай прадукцыі.

Каб атрымаць звальненне ад гэтага падатку, гаспадар павінен закантрактаваць агародніну і фрукты з арэалу, які перавышае неападаткаваны мінімум. Але не хопіць закантрактаваць, кантрактацыйную ўмову трэба выканаць.

Увядзенне гэтай пастановы (ад 1973 года) звязана з шырэйшым зацікаўленнем гаспадароў агародніцтвам і садаводствам, а гэта ў сваю чаргу павінна запэўніць лепшае забеспячэнне насельніцтва агароднінай і фруктамі.

На пленуме ВК ПАРП і ЗСЛ, які адбыўся ў снежні 1972 года ў Беластоку, гаварылася, што трэба больш актыўна дзейнічаць у галіне спрашчэння прадукцыі ў гаспадарствах, паступова пераходзячы да іх спецыялізацыі. Такі напрамак дзеяння сведчыць аб сучаснасці сельскай гаспадаркі і гарантуе хуткую яе інтэнсіфікацыю. Пачынаць гэтую справу трэба ад спецыялізацыі ў свінагадоўлі, жывёлагадоўлі і гадоўлі авец, а ў раслiннай прадукцыі — *ад агародніцтва.* (ак)

ЁСЦЬ КЛУБ

Дагэтуль моладзь і старэйшыя жыхары вёскі Тарнопаль Гайнаўскага павету не мелі дзе сабрацца ў доўгія асенні і зімовыя вечары. Асабліва сумна было моладзі. Марыла яна, каб дзе паглядзець тэлевізар, сыграць у шашкі або шахматы, арганізаваць патанцоўку. На канцэрт «Лявоніхі» або кінапераcоўку трэба было хадзіць у Семяноўку. Але вось у канцы мінулага года нараўкаўскі ГС адкрыў у Тарнопалі клуб селяніна. Знаходзіцца ён у прыватным доме Мікалая Бельскага. Пакойчык, які адступіў гаспадар на клуб, даволі прасторны. Ужо ў першыя дні існавання клуба масцовая моладзь склікала сход, на якім была выбрана Рада клуба і апрацаваны план працы клуба. Раду клуба ўзначаліў Мікалай Васько, а ў склад яе ўвайшлі яшчэ Зіна Ваўрэшук і Янка Янель. Моладзь пастанавіла як найхутчэй абсталяваць свой клуб. Мае на гэта нават уласныя грошы, якія зарабіла пры электрыфікацыі. Неўзабаве ў клубе будзе новы тэлевізар. Маладыя юнакі і дзяўчаты захацелі арганізаваць гурток БГКТ і заняцца мастацкай самадзейнасцю. Да гэтага мае зараз добрыя ўмовы. Сярод моладзі ёсць спевакі, ёсць нават паэт Уладзімір Гайдук. Ахвоты дружнай тарнопальскай моладзі да культурнай працы напэўна хопіць. Калі клубам зоймуцца маладыя, ніхто тут не будзе наракаць на нуду. (ця)

РАСТУЦЬ ЖЫЛЛЁВЫЯ ПАСЁЛКІ

У канцы лістапада пасёлак Гайнаўскага жыллёвага кааператыва павялічыўся яшчэ на адзін будынак, у якім атрымала кватэры 20 сем'яў. Быў ён перададзены ў карыстанне на чатыры месяцы раней. З пабудовай яго паспяхова справілася Бельскае будаўнічае прадпрыемства.

У Гайнаўцы спулдзельчых кватэр чакае каля 300 членаў. Штогод колькасць іх павялічваецца на 100 і больш асоб. Ключы да ўласнай кватэры атрымоўвае каля 50 сем'яў у год.

*

Нядаўна жыллёвы кааператыў у Сакольцы перадаў у карыстанне новы блок на 60 кватэр у пасёлку «Цэнтр». У суседстве яго будуюцца яшчэ два наступныя жылыя будынкі, у якіх кватэры атрымаюць 120 сем'яў. (ця)



Гайнаўка. Вуліца 1 Мая. *Фота Я. Цялушэцкага.*

ФАЛЬКЛОР

ЖАРТОЎНАЯ





Біла мэнэ маті бэрэзовым путом,
Што бы я нэ стояла з молодым рэкрутом.
Што бы я нэ стояла з молодым рэкрутом.
А я й собіе стояла аж куры запелі,
На двэры воду ляла, што бы нэ рыпелі.
На двэры воду ляла, што бы нэ рыпелі.
На двэры воду ляла, на пальцях ходіла,
Што бы маті нэ чула, што бы нэ сварыла.
Што бы маті нэ чула, што бы нэ сварыла.
А маті нэ спала і всё чысто чула,
То й мэнэ нэ сварыла — сама такою была.
То й мэнэ нэ сварыла — сама такою была.

Ад Марыі Парфенюк, 1951 года нараджэння, Ані Грыгарук, 1945 года нараджэння, і Ніны Грыц, 1952 года нараджэння, вёска Кленікі Гайнаўскага павету, запісаў 15 лістапада 1972 г. Мікалай Гайдук. З магнетафоннай стужкі нотны запіс зрабіў Эдуард Гойлік.

НА СПАРТЫЎНАЙ НІВЕ

СПОРТ У ПАВЕЦЕ

Вясковы спорт у Беластоцкім павеце мае сваю добрую шматгадовую традыцыю. Першыя ЛЗС-ы ўзніклі больш 25 гадоў таму назад у Гарадку, Харошчы, Заблудаве. Ад пачатку існавання ЛЗС непарыўна звязаны з іх дзейнасцю старшыня павятовага аб'яднання ЛЗС у Беластоку Чэслаў Ляўко — актыўны прапагандыст спорту на вёсцы. За гады сваёй працы на спартыўнай ніве ён з'яднаў сабе вялікі актыў, без якога цяжка цяпер уявіць сабе арганізацыю шматлікіх спартыўных мерапрыемстваў. У ліку актывістаў знаходзяцца Рышард Грышка, Мечыслаў Прахацкі, Галена Сламінская, Альфонс Фрайда, лекар Юрка Касакоўскі, Віктар Налівайка, Ян Жукоўскі, Мар'ян Капіца, Рышард Кулік, Сцяпан Нікіцюк. Многія з іх узнагароджаны адзнакамі «Заслужаны дзеяч ЛЗС», а таксама залатымі, сярэбранымі і бронзавымі ганаровымі адзнакамі ЛЗС. У апошні перыяд у Беластоцкім павеце каманд сяткоўкі ёсць 124, футбольных — 98, ёсць каманды ручнога мяча, а таксама лучнічыя і лыжныя секцыі. Існуюць таксама 33 жаночыя каманды, якія іграюць у сяткоўку. У суме павятовая арганізацыя ЛЗС налічвае 4 095 членаў, у тым ліку 854 дзяўчыны.

Добрых поспехаў дабілася лучнічая секцыя з вёскі Завады. Сваю дзейнасць тэты ЛЗС пачаў у 1955 годзе. Стральцы з лука займаюць першае месца ў ваяводстве. Займаюцца яны пад кіраўніцтвам Веслава Казімеровіча і Багуслава Рагалеўскага. Секцыя стральцоў налічвае 52 асобы з Завадаў, з раёнаў горада Беластока - Дзесяціны, Гурныя Дайліды. Добрай працай могуць пахваліцца таксама дзве завадаўскія футбольныя каманды. ЛЗС-аўцы з Завадаў у грамадскім чыне пабудавалі ў сябе спартыўную пляцоўку.

Адной з лепшых у ваяводстве з'яўляецца лыжная секцыя ў Аграднічках, у якой згуртаваліся лыжнікі таксама з Навадворцаў, Каракуляў, Цеснага і Завадаў. Ужо пару гадоў яна чэмпіён беластоцкай акругі. Працай гэтай секцыі кіруюць Яніна Раматоўская, Вячэслаў Пыжоўскі і Антон Свірыдовіч.

Каманды сяткоўкі з ПОМ-у ў Беласточку і з Сельскагаспадарчага тэхнікума ў Дайлідах перамаглі на ваяводскай алімпіядзе і будуць удзельнічаць у цэнтральнай алімпіядзе.

Паспяхова працуе секцыя сталовага тэніса пры ЛЗС «Лось» у Васількове. Выступае яна ў ваяводскай лізе. Апошнім часам на ваяводскім турніры Бася Савіцкая заняла другое месца.

Секцыя штангістаў з Беластоцкага павету выступае таксама ў ваяводскай лізе. Працай яе кіруюць Аляксей Прахарук і Юзэф Вайслаў.

Актыўнымі гурткамі ЛЗС з'яўляюцца гурткі ў Дайлідах Гурных, Супраслі, Тыкоціне, Валілах, Гарадку. Больш чым стоасабовы гурток ЛЗС у Дайлідах Гурных (старшыня яго Ян Шустко) мае футбольную каманду, якая выступае ў А класе. Спартсмены ЛЗС «Герман» у Тыкоціне (старшыня гуртка Юрка Крушэўскі) займаюцца футболам, цяжкай атлетыкай і сталовым тэнісам. У 1972 годзе заваявалі яны ў павятовых спаборніцтвах першае месца і кубак старшыні ПА ЛЗС.

Члены ЛЗС будуюць грамадскім чынам спартыўныя пляцоўкі ў сваіх вёсках. Пабудавалі іх у Шымках, Лявонавічах, Ізбішчах, Пяньках, Лубніках, Аграднічках. Будуецца спартыўная пляцоўка ў Васількове. Адным з найбольш актыўных у грамадскіх чынах з'яўляецца гурток ЛЗС, які дзейнічае пры Водна-меліярацыйным тэхнікуме ў Беластоку. Члены гэтага гуртка пабудавалі ля школы некалькі спартыўных пляцовак і бежню. Зрабілі яны апрача таго лавачкі і правялі электрычнасць над спартыўнымі пляцоўкамі. Грамадскіх чыноў выканалі яны на суму паўмільёна злотых. Пабудова спортпляцоўкі ў Аграднічках каштавала 180 тысяч злотых.

Павятовае праўленне ЛЗС арганізуе ўсё больш масавых спартыўных мерапрыемстваў, такіх як матаровыя злёты, велагонкі, спартакіяды ў грамадах. Дзеля гэтага праводзіць курсы на званне спартыўных інструктараў, суддзяў, арганізатараў спорту. Растуць кадры арганізатараў вясковага спорту.

Я. Цялушэцкі

Святкаванне 50-ай гадавіны СССР

ПАПУЛЯРНА-НАВУКОВАЯ СЕСІЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ЛІЦЭІ

22 снежня мінулага года ў сувязі са святкаваннем 50-ай гадавіны СССР у Гайнаўскім беларускім ліцэі адбылася папулярна-навуковая сесія. Былі прачытаны даклады ліцэістаў са старэйшых класаў на тэмы развіцця і дасягненняў Савецкага Саюза за гады існавання гэтай першай сацыялістычнай краіны ў свеце. У падрыхтоўцы дакладаў дапамагалі настаўнікі Васіль Сакоўскі і Эліза Кшэўская. Удзельнікі сесіі такім чынам паглыбілі свае веды аб жыцці савецкіх людзей.

Пасля афіцыяльнай часткі з мастацкай праграмай выступіла моладзь. Яна дэкламавала вершы і спявала песні на рускай, беларускай і ўкраінскай мовах.

Міхась Цялушэцкі,
вуч, кл. IVб Гайнаўскага беларускага ліцэя

© PDF: Kamunikat.org 2023
© PDF: Kamunikat.org 2023

 © PDF: Kamunikat.org 2023

ВЯЛІКІ КОНКУРС



„ШТО ВЕДАЕШ АБ САВЕЦКІМ САЮЗЕ"?

ЛІТОЎСКАЯ САВЕЦКАЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ РЭСПУБЛІКА

Літоўская ССР утворана 21 ліпеня 1940 г., у Саюз ССР увайшла 3 жніўня 1940 г. Тэрыторыя рэспублікі — 65,2 тыс. кв. км, насельніцтва — 3 мільёны 202 тысячы чалавек. У сталіцы Літоўскай ССР — горадзе Вільнюсе жыве звыш 400 тыс. чалавек.

Літва займае нізінную раўніну з марэнным рэльефам, на якой знаходзіцца Жэмайцкае ўзвышша, што дасягае 228 м вышыні над узроўнем мора. Самая вялікая рака Літвы — Нямунас (Нёман). У рэспубліцы знаходзіцца каля 4 000 азёраў, яны займаюць амаль 1,5 прац. тэрыторыі Літвы. На ўзбярэжжы Балтыйскага мора знаходзіцца вялікі порт Клайпеда і славуты курорт Паланга. Мінеральнымі водамі і прыгажосцю навакольнай прыроды славяцца курорты: Друскінінкай, Біршгонас, Лікенай, Кулаўтува і іншыя.

Клімат Літоўскай ССР, падобна як у нашай краіне, фармуецца пад уплывам Атлантычнага акіяна і Балтыйскага мора.


З карысных выкапняў у Літве знаходзяцца: торф, гіпс, крэйда, мергель, вапнякі, даламіты, розныя гліны і пяскі, фасфарыты і мінеральныя воды.

За гады Савецкай улады Літва стала прамыслова-аграрнай рэспублікай, у перыяд ад 1940 па 1971 гады прамысловая вытворчасць у ёй павялічылася ў 34 разы. Прамысловыя вырабы з Літоўскай ССР экспартуюцца ў 82 краіны свету. Асабліва хуткімі тэмпамі развіваюцца машынабудаўніцтва і металаапрацоўка, галоўным чынам прыладабудаванне, станкабудаванне, выраб электрычных машын, турбін, суднабудаўніцтва, а таксама хімічная прамысловасць і перапрацоўка нафты. Вялікія здабыткі ёсць і ў літоўскай энергетыцы. У сельскай гаспадарцы пераважае малочна-мясная жывёлагадоўля.

У 1971 годзе ў Літоўскай ССР было выпрацавана каля 7,5 мільярда кілават-гадзін электраэнергіі, здабыта 3,2 мільёна тон торфу, пабудавана 22,4 тысячы металарэжучых станкоў, 335 тысяч электрычных матораў сярэдніх і вялікай магутнасці і 2 мільёны 720 тысяч электраматораў малой магутнасці, выпрадукавана 99,7 мільёна кв. м розных тканін і 10,9 мільёна пар скуранога абутку. Дзякуючы вялікім капіталаўкладанням дзяржавы ў меліярацыю зямель і забеспячэнне сельскай гаспадаркі сучаснай тэхнікай у 1971 г. у Літве было 1 мільён 856,3 тысячы штук быдла і 2 мільёны 327 тысяч штук свіней.

Хутка расце дабрабыт і культурны ўзровень жыцця ў Літоўскай ССР. У ёй працуе 3432 агульнаадукацыйныя школы розных відаў і 79 сярэдніх спецыяльных школ, у 12 вышэйшых навучальных установах вучыцца каля 60 тысяч студэнтаў. Навуковыя даследаванні канцэнтруюцца ў Акадэміі навук Літоўскай ССР і 106 навуковых установах. У Літве працуе кінастудыя, тэлестудыя, радыё, 11 прафесіянальных тэатраў, выходзіць 211 газет, часопісаў і іншых перыядычных выданняў.

(мг)



На сцэне вільнюскага тэатра — літоўскі балет.

У кнігарні імпартных выданняў у Беластоку, вул Кілінскага 10, можна набыць наступныя кнігі на беларускай мове:

Мастацтва Беларускай ССР, 1972, цана 18 зл. 50 гр.

Выданне пад рэдакцыяй Л. Н. Дробава прадстаўляе самыя выдатныя творы беларускага савецкага мастацтва — жывапісу і скульптуры. Дасканалая рэч для азнаямлення з напрамкамі развіцця і дасягненнямі беларускага савецкага выяўленчага мастацтва! У кнізе змешчана 70 каляровых рэпрадукцый карцін і здымкаў (чорна-белых) скульптураў, усе яны вызначаюцца высокай тэхнічнай якасцю.

Рэкамендуем усім любіцелям беларускага мастацтва, асабліва ж школам, як дасканалы дапаможнік для настаўнікаў беларускай мовы.

Танк Максім, Лісткі календара, 1970, стар. 312, цана 7 зл. 80 гр.

Максіма Танка мы ведаем як вядучага паэта ў сучаснай беларускай літаратуры. У гэтай кнізе нам адкрываецца пяро Танка-празаіка, прычым у вельмі складаным жанры мемуарнай творчасці, дзе мастацкі вобраз і гістарычны факт мусяць утвараць адзінае цэлае. З «Лісткоў календара» паўстае перад намі складаны і багаты падзеямі перыяд 1935—1939 гадоў у жыцці пісьменніка, так званы віленскі перыяд яго творчасці.

Дасканалая літаратура для ўсіх зацікаўленых творчасцю Максіма Танка!

Александровіч Андрэй, Збор твораў у двух тамах, 1963; т. I, Вершы,



стар. 424, цана 8 зл. 50 гр., т. II, Паэмы і публіцыстыка, стар. 360, цана 6 зл. 90 гр.

У гэтае, вышаўшае ўжо пасля смерці аўтара выданне твораў Андрэя Александровіча ўвайшлі лепшыя здабыткі пісьменніка, напісаныя на працягу нядоўгага, але надта ж плённага яго творчага жыцця. А. Александровіч — гэта ў асноўным прадстаўнік беларускай паэзіі канца 20-ых і першай палавіны 30-ых гадоў. Упісаў ён у гісторыю беларускай паэзіі багатую старонку.

Рэкамендуем усім любіцелям беларускай паэзіі.

Русак Адам, Выбранае, 1972, стар. 160, цана 5 зл. 20 гр.

Адам Русак у беларускай сучаснай паэзіі займае асаблівае месца, ён увасабляе сабой музыканта (скончыў кансерваторыю, доўгія гады працаваў салістам аркестра) і паэта (літаратурную дзейнасць пачаў у 1927 годзе). Абодва гэтыя вельмі блізкія да сябе віды мастацтва склалі ў творчасці А. Русака адзінае цэлае, і мы сёння захапляемся ды і самі співаем папулярныя «Бывайце здаровы», «Бульбу», «Лясную песню», «Толькі з табою» і дзесяткі іншых дасканалых вершаў-песень, якія выйшлі з-пад пяра паэта-музыканта.

Гэтую маленькую кніжачку з серыі «Бібліятэка беларускай паэзіі» рэкамендуем усім любіцелям беларускага мастацкага слова.

Кнігарня імпартных выданняў у Беластоку ахвотна высылае кнігі за паштовым заліччэннем (з далучэннем рахункаў, калі гэтага патрабуе пакупнік). Запатрабаванні кіруйце па адрасу:

„Dom Książki", Białystok, ul. Kilińskiego 10.

(мг)



ЯК ЦЯБЕ БАЧАЦЬ, ТАК ЦЯБЕ ПІШУЦЬ

У КАРНАВАЛЕ — АБ ВАЧАХ КАБЕТЫ

Ужо даўно маляванне вачэй стала неадзоўным элементам дамскага макіяжу. Нават і вясковыя дзяўчаты, для матак якіх гэта было абсалютна нязнаным і недапушчальным, малююць вочы, ідучы на забаву ці ў госці, альбо на вечарынку ў клубе. Вядома, не варта маляваць вачэй пры працы, паколькі перашкаджае гэта, а асабліва туш, які можа размазацца і трапіць у вока, выклікаючы боль. Але ў карнавале прыгожыя вочы дзяўчатам асабліва патрэбны. Таму сёння мы прысвяцім некалькі радкоў іх вачам, а, уласна кажучы, таму, як іх маляваць, каб было і добра і прыгожа.

У апошні час спосаб малявання вачэй вельмі змяніўся. Раней малявалі кабеты перш за ўсё павекі — даволі тоўстай, цёмнай ці каляровай крэскай уздоўж павекі. Цяпер найважнейшым элементам, які ўвыпукляецца ў маляванні вока, з'яўляюцца расніцы. Іх падкручваюць спецыяльнай машынкай, моцна тушуюць, яны «цяжкія» — такія, як на здымках фільмовых артыстак з трыццатых гадоў. Крэскі на павеках цяпер рэдукаваны да мінімума — іх можна рабіць толькі, каб адзначыць контуры вока, асабліва тады, калі вока вельмі маленькае. У той жа час каляровыя цені вакол вока надалей актуальныя і, асабліва на вечар, робяць гэтыя цені вельмі моцныя, так, каб яны былі выразным фонам для расніц.


Такім чынам, калі хочам мець модны макіяж у карнавале, трэба хутчэй узяцца за догляд расніц, паколькі рэдка сустракаюцца натуральна густыя і доўгія. На вёсцы цяпер якраз такая пара, калі ёсць шмат вольнага часу, дык асабліва маладым дзяўчатам раім выкарыстаць яго для папраўлення сваёй прыгажосці.

Напрыклад, даўно вядома, што рыцынавы алей (касторка) дасканала ўплывае на расніцы. Калі правільна яго ўжываць і мець цярплівасць, то расніцы могуць стаць густыя і бліскучыя. Крыху алею наліваем на маленькую, найлепш дзіцячую шчотачку да зубоў і шчотачкаю расніцы знізу ўверх 20 разоў. Гэткую «аперацыю» трэба паўтараць штодзень раніцай і перад сном. На працягу дня добра было б некалькі разоў далікатна пацятнуць пальцамі кончыкі расніц, гэта ўзмацняе валасяныя цыбулькі.

Нельга расніц абразаць — няпраўда, што дзякуючы гэтаму расніцы будуць хутчэй расці. А вельмі важна затое, каб ніколі не пакідаць тушу нанач. Далікатныя валаскі абламліваюцца і крышацца пад уплывам непрарыўнага ўздзеяння хімічных субстанцый. Таму, юць амаль 1,5 прад тэрыторыі Літвы. маляваць вочы самім, ды толькі на дзень.

Сяброўка

Пачатак на стар. 1







БРАТЫ ПА КРЫВІ

зверскі яго білі, а пасля кінулі ў склеп. Разам з іншымі, якія ўцяклі з палону, яго закавалі ў кайданы, жалезнымі ланцугамі прывязалі да фурманкі, павалаклі ў мястэчка Саколку. Там зноў білі ў нямецкай камендатуры... Праз некалькі дзён чыгункай накіравалі яго ў Беласток, у той самы лагер, адкуль Іван Кулачко ўжо раз уцёк. Тут яго пазнаў адзін з ахраннікаў. І зноў па-зверску білі. Прыгаварылі накіраваць у карны блок!

Іван ведаў: з гэтага блока дарога адна — на той свет. Але не аб смерці думаў камсамолец І. Кулачко. Ён вынашваў план новай уцечкі. План неверагодны, амаль нездзейсніма. І гэты план з дапамогай таварышаў па лагеру і аднаго польскага чыгуначніка ўдалося ўсё ж ажыццявіць.

І зноў свабода! І зноў сяло Новы Востраў, сям'я Казлоўскіх. Адпачыўшы, змяніўшы паласатую лагерную куртку і штаны на грамадзянскую вопратку, накіраваўся Іван на ўсход.

18 сутак прабіраўся І. Кулачко лясамі і балотамі да лініі фронту. Але яна была далёка. Недзе пад Мінскам сустрэў Іван узброеных людзей з чырвонымі істужкамі на шапках і 12 снежня 1942 года ён стаў байцом партызанскага атрада імя Суворава.

Жорстка помсціў І. Кулачко нямецкім акупантам за здзекі над ім і яго таварышамі, якія давяліся перанесці ім у фашысцкіх лагерах. Не адзін гітлераўскі салдат назаўсёды застаўся на беларускай зямлі ад трапных выстралаў партызана-камсамольца Івана Кулачко.

У кастрычніку 1943 года, калі камандаванне партызанскім рухам Беларусі ў гонар юбілею Ленінскага камсамола стварыла новы партызанскі атрад імя 25-годдзя ВЛКСМ, І. Кулачко адным з першых быў накіраваны ў гэты атрад.

У атрадзе імя 25-годдзя ВЛКСМ камсамолец Іван Кулачко прайшоў шлях ад радавога байца да партызанскага афіцэра. За адвагу, якую праявіў ён у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, І. Кулачко быў узнагароджан ордэнам Чырвонай зоркі і медалем «Партызану Айчыннай вайны 1941—45 г.г.» першай ступені.

Летам 1944 года партызанскі атрад імя 25-годдзя ВЛКСМ спалучыўся з Савецкай Арміяй. Большасць партызанаў улілося ў яе рады. Івану Кулачко прапанавалі застацца на савецкай рабоце ў Беларусі. Але ці мог ён заставацца ў тылу?

Ужо ў форме савецкага воіна пайшоў ён на захад. Граміў фашыстаў на іх зямлі, вылучыўся ў баях на рацэ Одры, прымаў удзел в узяцці горада і вялікага марскога порта Шчэцін.

Пасля вайны Іван Кулачко вярнуўся ў роднае сяло Байдаўку, паступіў працаваць на Старабельскі камбінат хлебапрадуктаў, дзе працуе і па сённяшні дзень. Працуе з агеньком, чэсна, добрасумленна. Кіраўніцтва камбіната няраз адзначала Івана Яфімавіча Кулачко прэміямі, граматамі. На грудзях былога партызана-воіна побач з баявымі ўзнагародамі — значок ударніка камуністычнай працы.

Шмат вады ўцякло ад таго памятнага для І. Я. Кулачко дня, калі восенню 1941 года сустрэў ён у лесе каля польскай вёскі Новы Востраў падростка Шуру Казлоўскага, які прывёў яго, галоднага, у свой дом. Але ўсе гэтыя гады памятаў Іван Яфімавіч сям'ю польскіх беларусаў, падаўшую брацкую руку дапамогі ў цяжкія для яго дні.

І. Я. Кулачко ўдалося наладзіць перапіску з сям'ёй Казлоўскіх, якая паранейшаму жыве ў сяле Новы Востраў Беластоцкага ваяводства. Шура — Аляксандр Казлоўскі працуе ў мястэчку Саколцы. У яго два сыны. Аднаго з іх ён назваў Іванам у гонар свайго ўкраінскага сябра.

Ужо некалькі гадзін мы сядзім за сталом у маёй кватэры. Даўно астыў чай у шклянках. Ляжаць некранутыя пачастункі. А Іван і Аляксандр усё ніяк не могуць наглядзецца адзін на другога.

— А памятаеш?..

І зноў успаміны, якія нахлынулі з тых далёкіх, суровых гадоў...

Я не раз чуў ад І. Я. Кулачко гэту гісторыю. Чытаў дакументы, пацвярджаючыя ўсё расказанае вышэй. 7 мая 1970 года, у канун 25-годдзя перамогі над фашысцкай Германіяй, Варашылаўградскае абласное радыё перадало мой нарыс «Народны мсціўца» аб партызане Іване Яфімавічу Кулачко. І вось цяпер, слухаючы ўспаміны двух сяброў, якія прыйшлі да мяне ў хату, каб падзяліцца сваёй радасцю сустрэчы праз 30 год, я ўглядаюся ў твары маіх гасцей, і мне здаецца, што ў іх рысах ёсць нешта супольнае, падобнае, аднолькавае. Што?

Іван Кулачко гаворыць па-украінску. Аляксандр Казлоўскі — на мяшанай беларуска-украінска-польскай мове. Я — рускі, але выдатна разумею іх абодвух.

Дык вось што супольнае, падобнае, аднолькавае і ў рысах таварышаў і ў размове гэтых двух людзей розных нацыянальнасцей, стаўшых братамі, якіх спалучыў ваенны лёс. Яны — прадстаўнікі двух брацкіх славянскіх народаў — браты па крыві, браты адзінай сацыялістычнай сям'і, адзінай сацыялістычнай садружнасці нацый.

Канстанцін Галіч

© PDF: Kamunikat.org 2023 © PDF: Kamunikat.org 2023

ТРЫБУНА чытачоў

ДАР СЭРЦА

Ганаровае донарства зараз шырока вядома ў Гайнаўскім павеце. Кроў аддае каля тысячы асоб. Гэтага каштоўнага лякарства збіраецца каля 70 літраў у год. Найактыўнейшымі донарамі з'яўляюцца: Міхась Якубоўскі з Кляшчэляў, Віктар Андросюк з Ахрымаў, Рыгор Анішчук са Скупава, Мечыслаў Карытоўскі з Нараўкі, Міхась Паскробка з Ласінкі, Міхась Младзяноўскі са Старыны, Збігнеў Піскорскі, Яўген Мядзведзь і Юры Бэчак з Гайнаўкі. З нагоды святкавання Дзён ганаровага донара адзнакамі «Заслужанага донара» былі ўзнагароджаны: Рыгор Анішчук, Мечыслаў Карытоўскі, Міхась Младзяноўскі і Міхась Якубоўскі. Залатыя адзнакі «Ганаровага донара» атрымалі Віктар Андросюк і Юры Бэчак. (ця)

У САКОЛЬСКІМ ПДК

Павятовы дом культуры ў Саколцы добра працуе з дзецьмі і моладдзю. Адбываюцца тут вечарыны казак, вечарыны дзіцячых гульняў. Дзейнічае тут лялечны калектыў, які ў павятовым аглядзе мастацкіх калектываў заняў першае месца. Актыўна працуюць гурткі жывога слова, музычны, фатаграфічны і жывапісцаў. Удзельнікі фатаграфічнага гуртка і гуртка жывапісцаў часта наладжваюць выстаўкі сваіх прац. (ця)



КАБЫЛА ВІНАВАТА

Зіма стала. Хвала Богу,
Скрозь направіла дарогу.
Людзі ў руху. Хто да лесу,
На кірмаш, хто да гаэсу.
Рана Філімон на рынку
Прадаў тлусценькую свінку.
Змёрз парадкам Філімон,
Да гасподы суне ён.
«Абагрэюся як след,
З'ем гарачанькі абед,
А мо і чарачку адну
«Выбаровай» кульгану.
Больш ні каплі, ні расіны
(Прысягаў для жонкі Зіны),
І дадому паспяшаю,
Шмат работы дома маю».
Толькі выпіў смачна чарку,
Чорт прынёс аднекуль Марку,
Антася і Юрка з «кулка».
Змантавалася суполка.
Усе па чарцы па адной —
Разгарнуўся баль гарой.
За ўсё плаціць Філімон,
Сёння ж свінку прадаў ён.
Пару літраў асушылі,
Ехаці дамоў рашылі.
Усім ужо нутро гарэла,
На дварэ зусім сцямнела.
Марка сеў на перадок,
Антось з Юркам на задок,
Філімон, як на карэтку,
Ледзь залез на свіна-клетку.
Свіснуў пугай фурман Марка,
Скочыла кабыла шпарка,
Воз к адхону шуганула,
На бок клетку павярнула.
Філімон, задраўшы ногі,
З ходу грымнуў уздоўж дарогі,
Бокам грохнуўся на брук,
Аж пайшоў навокал гук.
Антось з Маркам, Юрка з «кулка» —
На зямлі уся суполка.
Нат і пікнуць не паспелі,
Як у роў на дно ўляцелі.
А спалохана кабыла
Панясла, ўсё пагубіла.
Ці шчасліві лёс, ці Бог
Ад калецтва ўсё ж збярог.
П'яныя хоць пастагналі,
Хоць з пакутаю, ды ўсталі,
І пяшочкам ў ноч пайшлі...
І да вываду дайшлі,
Што ўсяму кабыла вінна.
То ж свядомай быць павінна,
А не свінскае натуры:
Ні сораму, ні культуры.
Вываліць людзей, ўдачы,
Да таго яшчэ ўначы.

Філімон ішоў панура,
Бушавалі ў душы буры,
Ногі фіглі вывівалі,
Ў вачах чорцікі скакалі.
Боль ў баку, у грудзях млосна.
Ты, гарэлка, вельмі злосна!
Дакуль буду цябе піць,
Жонку і сябе губіць?!

Каму волі брак, развагі,
Усыпаць таму добра дзягі.

Міхась Красоўскі, Малынка

«УСЁ ВЕДАЮ АБ КРАІНЕ САВЕТАЎ»

Пад такім загалоўкам бібліятэка ў Грэдалях арганізавала конкурс. Першай заяўку злажыла Галіна Бурыла са станцыі Грыгораўцы. Прыступілі таксама да конкурсу чытачы з Алекшаў, якія выканалі фотагазетку «50 год СССР», Аня Амельянюк і Валя Барташук з Грэдалёў. Прыступае да конкурсу таксама бібліятэчны пункт у Дыдулях. Заяўкі прымае кіраўнічка пункту Галіна Рыжык. У Грыгароўцах арганізатарам конкурсу з'яўляецца старшыня гуртка ЗМВ Раіса Крот.

Наглядальнік

МІЛЬЁННЫЯ АБАРОТЫ

Сельскагаспадарчы гурток у Паўднёвым Востраве, што на Сакольшчыне, мае цяпер 12 трактараў і 3 камбайны. Дзякуючы высокай механізацыі, у пару сабрана там збожжа і ўжо 15 снежня закончаны былі абмалоты ў вёсках, якія абслугоўвае сельгасгурток.

Гэты сельгасгурток апрацоўвае 250 га зямлі з дзяржаўнага фонду. За збожжа, сабранае з гэтых гектараў, гурток атрымаў 1.600 тыс. зл. Гурток правёў ужо рэгістрацыю запатрабавання на працу сельскагаспадарчых машын у 1973 годзе і згодна з гэтым апрацоўвае план працы ў наступным годзе. (мх)

КАРЫСНЫ ПАЧЫН

У Дубічах Царкоўных пры святліцы насупраць дзвярэй будуюцца мураваныя сені. Дагэтуль у святліцу ўваходзілі адразу з панадворка, і ў час завірухі нёсся снег у сярэдзіну, як праз рэшата. Таксама было і з холадам. Адны дзверы дрэнна трымалі цяпло. Цяпер станоўішча зменіцца, бо кожны будзе ўваходзіць спярша ў сені, а потым у залу.

М. Панфілюк



Дарагое «Сэрцайка»!

Нядаўна закончыла я школу і атрымала працу ў невялікім горадзе Б. Са мной працуюць маладыя дзяўчаты і хлопцы, з якімі я пасябравала, а таксама маю сяброў і сяброваk ў горадзе, бо ў такім малым мястэчку, амаль як на вёсцы, усе з сабой знаюцца. Хаця мястэчка малое, але мы весела і культурна праводзім тут час пасля працы. Вясною мінулага года адзін з маіх калег жаніўся. Вяселле было гучнае, запрасіў шмат моладзі, сярод якой была і я. І тут пазнаёмілася я з хлопцам, Вітэк ён завецца. Ад гэтага часу мы вельмі часта спатыкаліся, пакольі Вітэк жыве ў тым жа горадзе. Правілі мы разам лета, а восенню мой хлопец паехаў у Варшаву на вучобу. Нагаварваў і мяне, каб я пачала вучыцца завочна, што я маладая і, калі маю магчымасці, дык няма чаго траціць час. Я наогул не думала вучыцца, але пасля гэтых размоў набрала ахвоты. Пастанавіла падрыхтавацца і ў гэтым годзе здаваць экзамены. Сумна мне было па Вітку, аднак ён часта пісаў да мяне пісьмы, час ад часу званіў да мяне на работу і часта сам прыязджаў. Я пакахала Вітка. Але нашы кантакты парваліся. Вітэк не піша ўжо да мяне пісем, не звоніць, відаць, не прыязджае, бо ўжо даўно я яго не бачыла. Страшна перажываю я гэта. Не маю ахвоты нікуды ісці пасля працы з сяброўкамі, пераважна сяджу дома адна. Адпала ў мяне ахвота і ад навукі. Не ведаю, што рабіць. Мо напісаць да Вітка? Што ты на гэта, «Сэрцайка»? З нецярплівасцю чакаю тваіго адказу.

Эля з Бельшчыны

Эля! Пісаць да Вітка не раю. Ён жа знае твой адрас. І калі нават парваў з табою — не падай духам! У каханні ўсяк бывае, і «рэцэптаў» на яго няма. А мо ёсць іншая якая прычына яго маўчання. Пачакай цярпліва — час найлепшы дарадчык, ён высвятліць справу. Дрэнна робіш, Эля, што сядзіш, зашыўшыся ў куток, ды раздумваеш! Наадварот — як найбольш таварыскіх кантактаў! Займіся кніжкай, рыхтуйся да экзаменаў — будзе табе і лягчэй, і карысней. Ты маладая, не аднаго хлопца яшчэ спаткаеш, а страчаных гадоў навукі не вернеш!

«Сэрцайка»

ШКОЛЬНЫ КААПЕРАТЫЎ «ДРУЖБА»

Ужо 12 год дзейнічае ў тэхнікуме рахункаводства ў Бельску вучнёўскі кааператыў «Дружба». Працуе ён паспяхова. Даходы кааператыва ўзраслі з 19 тысяч злотых у 1970 годзе да 31 тысячы злотых у 1972 годзе. Членамі кааператыва з'яўляюцца амаль усе вучні: 454 кааператыўшчыкі. Ёсць тут некалькі галін дзейнасці. Найбольш важная — гандлёвая. У краме вучні купляюць папяровыя тавары, школьныя прылады, спажывецкія і іншыя тавары. Практычна кааператыў з'яўляецца навуковым дапаможнікам. Кожны кааператыўшчык абавязаны прайсці праз усе функцыі, звязаныя з вядзеннем гандлю. Абавязаны быць крамнікам, павінен правесці рэманент, пазнаёміцца з дакументацыяй куплі і продажу, весці гандлёвыя запісы ў адпаведных кніжках. Гэта вельмі прыдатна для будучых бухгалтараў.

У бухгалтэрыі вучнёўскага кааператыва поўны парадак. Асабліва тут выдзяляюцца Ірэна Петушынская і Аліцыя Красіцкая.

Сярод членаў кааператыва выбіраюцца на агульным сходзе органы самаўпраўлення: надзорчая рада і праўленне. Сочаць яны за дзейнасцю кааператыва і за раўнамерным падзелам працы паміж членамі. У 1972 гаспадарчым годзе функцыю прадаўшчыкоў у краме выконвалі74 асобы, 16 чалавек працавала ў надзорчай радзе, 11 — у праўленні. Пры рэманентах працавала 75 чалавек, дастаўшчыкамі было 14, пры зборы макулатуры працавалі 22 асобы, а ў фінансах 9 асоб. Сярод прадаўшчыкоў найлепшымі былі Марыя Суліма, Альжбета Кандрат, Крыстына Гулян і Галіна Залеўская. Інвентарызацыйным камісіям найбольш старшынствавала Ірэна Эканамнюк.


Кааператыў збірае таксама макулатуру. У 1972 годзе сабраў і даставіў яе на пункт скупкі 1800 кг. Трэба адзначыць таксама дзейнасць у галінах ашчаднасці, шкалення і культурна-асветнай. З атрыманых даходаў шмат грошай прызначаецца на патрэбы вучняў і на карысныя культурна-асветныя мерапрыемствы: экскурсіі, кніжныя ўзнагароды і інш.

Мікалай Няплоха, апякун школьнага кааператыва

НОВЫ КІЁСК «РУХУ»

Ад 1 студзеня 1973 года пачаў працу кіёск «Руху» ў вёсцы Дубічы Царкоўныя Гайнаўскага павету. Працуе ў ім жыхарка гэтай вёскі Ніна Чыквін. Варта дадаць, што дагэтуль у Дубічах Царкоўных не было ні клуба, ні кіёска «Руху». (ця)

НОВЫ ПУНКТ СКУПКІ МАЛАКА



У пачатку лістапада мінулага года ў вёсцы Бяндзюга Беластоцкага павету быў перададзены ў карыстанне новы пункт скупкі малака. Ёсць тут электрычнае святло і неабходнае абсталяванне. Каштаваў будынак 250 тысяч злотых. Цяпер у Бяндзюгу возяць малако сяляне не толькі з гэтай вёскі, але і з навакольных вёсак Сушча, Марынка, Калеснае і Супруны. Збіраецца яго больш 500 літраў. Калі пацеляцца каровы, будзе яго значна больш. Мясцовыя жыхары вельмі задаволены новай злеўняй малака. Ім не трэба цяпер вазіць малако аж за шэсць кіламетраў у Круглы Лясок.

Тэкст і фота Я. Цялушэцкага



О. А., Соцы. Рассеянасць — нармальная з'ява ў творчым працэсе. Калі думкі ўцякаюць, трэба іх яшчэ хутчэй запісваць, хоць гэта яшчэ не гарантуе, што будзе добры верш. Каб ён узнік, трэба прасеяць многа розных думак. Дашліце свае вершы. На аснове аднаго цяжка канкрэтна выказацца.

Н. Кучынская, Бельск. Калі рыфмуеце, дык трэба шукаць слоў найбольш трапных, а не першае, якое толькі трапляе ў рыфму. Тады і думка робіцца больш ясная, і лепш відаць вобраз. Да друку пойдзе «Што?»

Янка Грыгарук, Галады. «Зіму» надрукуем.

Ніна Матысюк, Гайнаўка. Вершы нам спадабаліся. Асабліва «Як забыці?» і «Нашэ сэло». Канкрэтныя, свежыя. А ў «Маіх марах» адчуваецца ўплыў літаратуры (Купала, Канапніцкая?). Мы за вершы, напісаныя пад непасрэдным уплывам так званага жыцця. Таму друкаваць будзем першыя.

КІНО

ГАЙНАЎСКІ ПАВЕТ

Кляшчэлі
„Żona dla Australijczyka" (polski), 16—17. „Polonez Ogińskiego" (radz.), 18—19. „Przez pustynię" (meksyk.), 20—21.

Нараўка
„Kupujemy wóz strażacki" (NRD), „Testament Agi" (węg), 17—21.

Нарва
„Seksolatki" (polski), „Kaukazka branka" (radz.), 17—21.

Чыжы
„Oficerowie" (radz.), „Umrzeć z miłości" (franc.), 17—21.

Дубічы Царкоўныя
„Orzeł w klatce" (jugosł.), „Oczami przyjaciół" (polski)) 17—21.

Арэшкава
„Zbrodnia i kara" (radz.), „Jutro na orbitę" (radz.), 20—21.

БЕЛЬСКІ ПАВЕТ

Боцькі
„Przygody misia Yogi" (USA), „Przystań" (polski), 17—21.

Орля
„Wujaszek Wania" (radz.), „Wojenka, wojenka" (węgierski), 17—21.

Райск
„Uciec jak najbliżej" (polski), „Krzyżacy" (polski) 17—21.

САКОЛЬСКІ ПАВЕТ

Крынкі
„Sól ziemi czarnej" (polski), 16—17. „12 krzeseł" 18—19. „Ktoś za drzwiami" (franc.), 20—21.

Шудзялава
„Agent nr 1" (polski), „Okruchy życia" (franc.), 17—21.

Янаў
„Zabijcie czarną owcę" (polski), 17—21.

СЯМЯЦІЦКІ ПАВЕТ

Нурэц
„Giuseppe w Warszawie" (polski), 16—17. „Królewski błąd" (czeski), 18—19. „Śmierć Ipu" (rumuński), 20—21.

Мельнік
„Zdobywcy nieba" (radz.), 16—17. „Ostatnia gra Karima" (radz.), 18—19. „Śledztwo w sprawie obywatela poza wszelkim podejrzeniem" (włoski), 20—21.

Мілейчыцы
„Przeciwko Bogom" (polski), 16—17. „Sokoły" (węgierski), 18—19. „Pilot helikoptera" (rumuński), 20—21.

ДУБРОЎСКІ ПАВЕТ

Сухаволя
„Tam, gdzie rośnie czerwony bór" (jugosł.), „Hełm Aleksandra Macedońskiego" (radz.), 17—21.

Новы Двор
„Uciec jak najbliżej" (polski, „Morderca jest w domu" (węgierski), 17—21.

Ніва

Organ Zarządu Głównego Białoruskiego Towarzystwa Społeczno-Kulturalnego

Adres redakcji: Białystok, ul. Wesołowskiego 1. Telefony: red. naczelny 2-10-33, centrala 2-32-41 do 45. Warunki prenumeraty: miesięcznie — 2,40 zł, kwartalnie — 7,20 zł, półrocznie — 14,40 zł, rocznie — 28,80 zł. Prenumeratę przyjmują wszystkie placówki pocztowe i listonosze. Wpłaty na prenumeratę indywidualną należy dokonywać na konto PUPiK „Ruch" Nr 102-7-161 NBP Białystok I Oddział Miejski. Na odwrocie blankietu należy podać okres prenumeraty i tytuł zamawianego pisma. Zamówienia ze zleceniem wysyłki za granicę przyjmuje — Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23. Nr konta PKO 1-6-100024. Zamówienia z krajów europejskich jak i zamorskich należy kierować pod adresem Przedsiębiorstwo Kolportażu Wydawnictw Zagranicznych „Ruch" Warszawa, ul. Wronia 23.

BZGraf. Nakład 7.163 K-1

Літоўская казка

Чаму кот мыецца пасля яды

Аднойчы заляцеў верабей на сялянскі панадворак і пачаў дзяўбсці зярняты.

Скача верабей па траве, зярняты за зярнятамі падбірае, а гаспадарскі кот на яго з-пад вугла паглядае. Глядзеў кот, глядзеў ды як скочыць на вераб'я! Схапіў за крыло і гаворыць:

— Нядрэнна я зараз паснедаю!

— Што вы, што вы, пане кот!, — зацвыркаў верабей. — Няўжо вы збіраецеся мяне з'есці?

— А што мне, любавацца табой, ці што? — фыркнуў кот і падрыхтаваўся скруціць вераб'іную галаву.

— Ды пасаромецеся ж, пане кот! — зноў зацвыркаў верабей. — Вы ж забыліся ўмыцца! А ці ж вы не ведаеце, што гаспадар ваш, і гаспадыня, і ўсе людзі на свеце спачатку мыюцца, а потым снедаюць?

— І то праўда! — сказаў кот і падняў лапку, каб добранька пацерці сабе мордачку.

А верабей, нядоўга думаючы, скок у бок! Махнуў крыламі і паляцеў.

Вельмі разгневаўся кот.

— Ну, не, цяпер ужо мяне не ашукаеш! — сказаў ён. — Хай людзі робяць як ведаюць, а я спачатку буду снедаць, потым умывацца.

З тых пор усе каты на свеце мыюцца пасля яды.

Зімовы дэсант.

СПОСАБ

— Доктар, калі позна ўначы я пішу вершы, то да раніцы ўжо не магу заснуць.

— А вы паспрабуйце прачытаць тое, што напісалі.

ДОБРАНЬКІ

Адна дама скардзіцца другой:

— Разумееце, мая мілачка, гэтыя нягоднікі далі майму сыну два гады!

— А ён што, невінаваты?

— Ён самы добры і паслухмяны сын. Усё што краў, прыносіў дамоў.

НІЎКА

Народны жарт

КУМ ДА КУМА ЗАВІТАЎ

Адарваўшыся ад спраў,
Кум да кума завітаў.
І пра тое і пра гэта
Гаварылі дружбакі.
Закурылі цыгарэты —
Дыму коцяцца клубкі.

Зноў яны пагаварылі,
Зноў сумесна закурылі.
Гаспадар удзячны дужа,
Сыпле макам залатым:
— Дзякуй, куме, дзякуй,
дружа,
Што мяне наведаў ты.
Закуры яшчэ, браток,
Даражэнькі мой кумок.
Ты ж прыехаў бы з кумой.

Госць на гэта бровы
хмурыць:
— А навошта ехаць ёй
Да цябе. Кума ж не курыць.

С. Пацёмкін

ДОКАЗ

— Кажуць, што наступная вайна будзе весціся па радыё.

— Магчыма, я ўжо чуў некалькі жудасных перадач.

ПРАЛЬНЫЯ МАШЫНЫ

— Ведаеш, даражэнькая, хацела купіць пральную машыну, але мацi прыехала.

ГУМАР З

Аднойчы мачаха паехала ў горад на кірмаш. Накупіла ўсякай ўсячыны. А потым вырашыла купіць падчарыцы коржыкаў.

Калі прыехала дамоў, шкада ёй стала тыя коржыкі падчарыцы аддаваць. Вырашыла з'есці іх сама. Узяла непрыкметна коржыкі ў руку, усунула галаву ў печ і есць.

Дзяўчынка падбегла да маці і пытае:

— А што гэта вы, мама, робіце?

— Ды печ латаю, — адказала маці.

— А чаго ж у вас, мама, вушы варушацца?

● Ён умеў рабіць дзве справы адначасова: думаць адно, а гаварыць другое.

● Яму гаварылі: «Ты яшчэ малады, гарачы. Але, верым, выправішся». І мелі рацыю: з часам ён стаў старым і халодным.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Антаніны Нічыпарук, Веры і Аліны Іванюк з вёскі Малінніki змяшчаем польскую песню

BĘDZIESZ TY

Nie nazwana, ale bliska
w moich słowach, w moich myślach
będziesz ty.
W przemijaniu dni i godzin,
w wierszu, który za mną chodzi,
będziesz ty.
W listach, które czasem piszę
i w milczeniu, które słyszę,
będziesz ty.
W każdej stronie mego świata
i w najwyższej trawie lata,
będziesz ty.
W mej podróży przez codzienność
zawsze przy mnie, zawsze ze mną
będziesz ty.
W zamyśleniu i w rozmowie,
w róży, która parzy dłonie,
będziesz ty.
W echu, które wraca znikąd,
w ciszy, która jest muzyką,
będziesz ty.
W bezsenności mej i we śnie,
nie nazwana dzisiaj jeszcze,
będziesz ty.
Podzielimy między siebie
całe niebo, całą ziemię,
każdą radość niecierpliwą,
to co będzie, to co było,
wszystkie nasze dzienne sprawy,
wszystkie nasze zapomnienia,
bo prócz siebie nic nie mamy,
nic nie mamy do stracenia.

З літоўскага гумару

Суседка дзеліцца навінкамі:

— Учора мой сын зваліўся з чацвертага паверха, але нічагусенькі яму не сталася.

— Няўжо?

Тут падыйшоў Кіндзюліс і сказаў:

— Вы жывеце ў новым доме, а будаўнікі пакінулі кучу смецця вышынёй да чацвертага паверха.

* * *

Кіндзюліс падарожнічае па Чэхаславакіі з турысцкай групай.

— Мы праходзім міма старэйшай піўной Прагі, — паказвае гід на старадаўні будынак.

Тут да яго падбег Кіндзюліс і спытаў:

— А чаму міма?

У ШКОЛЕ

Першакласнік Юра вярнуўся са школы і заявіў:

— У школу больш не пайду.

— Чаму? — спытала бабуля.

— Бо там прымушаюць чытаць і пісаць, а я не ўмею, а размаўляць умею, дык на ўроках не дазваляюць.

ЧАМУ

Чаму ты такі збянтэжаны, Фрэд? Што-небудзь здарылася?

— Я думаю пра сваю будучыню.

— І што ж цябе так бянтэжыць?

— Усё: і мінулае, і будучае.

«Дзейнічаючы» вулкан.

Галаваломка

Нарысуйце фігуру адной непарыўнай лініяй, не адрываючы алоўка ад паперы.

Адказ на заданне з папярэдняга нумара:

1	7	2	8
4	6	3	5
7	1	8	2
6	4	5	3

ПАРАДА

— Алё! Алё! Гэта домакіраўніцтва? Паслухайце, я сяджу ў ванне, намыліўся, а вады не стала. Скажыце, што мне рабіць?

— Вазьміце брытву і пагаліцеся.

ПАСПРАБУЙ

— Сын мой, не існуе такіх цяжкасцей, якія б нельга было пераадолець настойлівасцю і ўпартасцю.

— Ты так думаеш, тата? Тады паспрабуй выцісніць зубную пасту з цюбіка, а потым уцісніць яе зноў у цюбік.

ВЫНІК

— Гэта траўма — вынік аўтамабільнай катастрофы?

— Так, доктар.

— Відаць, вельмі хутка ездзіце?

— Не, вельмі паволі хаджу.

— Хачу ўвайсці ў спартыўную форму!

Курёзы

СУТЫЧКА З ПІРАТАМІ

І сёння яшчэ ў адкрытым моры на поўдні Філіпін здараюцца сутычкі з піратамі. У мінулым годзе ў раёне архіпелага Сулу група ўзброеных піратаў напала на філіпінскае судна. У жорсткай сустрэчы з марскімі бандытамі 5 чалавек экіпажа былі забіты, двое паранены.

КОТ СУПРАЦЬ ЛАЙНЕРА

Існуюць забабоны: «Перабяжыць дарогу чорная кошка — не быць дабру. Дагэтуль, аднак, сустрэча з чорнай кошкай у паветры не пагражала нават найбольш забабоннаму чалавеку...

...У аэрапорце Антарыо самалёт ужо ўзнімаўся ў паветра, калі з клеткі, што была ў багажы, выскачыў чорны кот. У пошуках выхаду ён дастаўся ў кабіну пілотаў і пачаў буяніць, кідаючыся на членаў экіпажа. Узлёт быў спынен, пасажыры пераведзены на другі самалёт, а спецыяльна выкліканай паліцэйскай камандзе было даручана злавіць і ўціхамірыць буяна.

ПЛАКАТ

У парку ля малітоўні баптысцкай абшчыны ў горадзе Александрыі (штат Вірджынія, ЗША) вісіць плакат: «Уваход толькі для веруючых. Парушальнікі будуць ахрышчаны!»

Смяюцца з намі

Праз замочную дзірку бачыць заўсёды больш, чым праз адчыненыя дзверы.